Зіна і Сашка Несцерукі ☞ 9

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Сяброўская бяседа - 2008 ☞ 4,12

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 31 (2725) Год LIII | Беласток, 3 жніўня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Новая ідэя павароту

Фота Ганны Кандрацюк

Удзельнікі „Трыялогаў", Лапічы, 25-27.07.2008

Сакрат Яновіч, які заўсёды здзіўляецца сам сабе, чарговы раз здзівіў удзельнікаў сваіх „Трыялогаў". У гэты раз гаспадар Villa Sokrates запрасіў на старажытныя гарадзішчы і шляхі Падляшша. У цэнтры разважанняў апынулася наша зямля і яе значэнне ў Еўропе. Праўда, месца літаратурна-мастацкага семінара не памянялася. Як кожны год, у Лапічы прыехалі перакладчыкі, гісторыкі, літаратурныя крытыкі, мастакі з Берліна, Варшавы, Гродна, Будапешта, Венецыі, Мінска і пабывалі тут тры дні з 25 па 27 ліпення г.г.

* * *

У першы дзень „Трыялогаў" ладзілася сапраўднае падарожжа ў Кнышынскую пушчу. Па дарозе ў вочы кінуўся ўказальнік „Шудзялава". Балцкі назоў мясціны мясцовыя краязнаўцы выводзяць ад племя яцвягаў-судавянаў, якое прыйшло сюды з поўначы. Зараз у вёсцы імя вымерлага племя прыняла футбольная каманда „Sudovia". Сам Яновіч, як ніхто ў нас, зведаў балцкія сцежкі. Раней, каб наткнуцца на іх след, літаратар звандраваў Сувальшчыну.

— А нядаўна чуў я ад нашага лесніка, што і тут знайшлі яцвяжскае гарадзішча, — дадае аўтар „Скроўбы". — І каб яшчэ нехта палічыў усе тыя балцкія тапанімы і неславянскія словы пад Крынкамі.

— Зварот у бок курганоў можна назваць новай ідэяй павароту, — кажа Януш Корбэль — чалавек духу, публіцыст, эколаг і сацыёлаг з Белавежы.

Мы як цывілізацыя Homo sapiens апынуліся секунду перад канчынай. Сённяшніх людзей мы можам падзяліць на дзве плыні. Адны з іх бягуць разам з цывілізацыяй і не могуць ужо спыніцца, другія спыняюцца, абмяркоўваюць свой жыццёвы шлях. Сучасны чалавек разумее сэнс жыцця адназначна, ён ставіць сабе мэты і рэалізуе іх. Ці не лепш вандраваць, знаходзіць сваю дарогу? Бо мы такія, як наш гістарычны досвед...

У мультымедыйнай прэзентацыі Януш Корбэль расказаў пра гарадзішча ў Гацьках. Знойдзены тут сляды яшчэ з каменнага і жалезнага вякоў. Жылі там уграфіны, кельты, готы, балты... І адносна нядаўна паявіліся славяне... Памяць названых народаў зафіксавана ў крыві падляшука.

* * *

Якое значэнне для Еўропы можа мець нашае беднае і занядбанае Падляшша? Гэтае пытанне цягам дзесяці гадоў высвятлялася на „Трыялогах". І як заўсёды гаспадару Villa Sokrates дапамагала здзіўленне.

— На працягу дзесяці гадоў я зразумеў, што Падляшша вельмі важнае ў Еўропе. Тут узнікалі ўсе культурныя і палітычныя плыні. Тут пачатак беларускага палітычнага руху. Адсюль выводзяцца пачынальнікі і змагары — Язэп Ярашэвіч, Кастусь Каліноўскі, Усевалад Ігнатоўскі... З Падляшша шмат вядомых постацей у польскай гісторыі. І калі б прыглянуцца бліжэй, то пакажацца, што ўвесь час за гэтую бедную тэрыторыю змагаюцца ці то крыжаносцы, ці шведы, ці расіяне. Заўсёды так было, што хто авалодваў Падляшшам, той завалодваў цэлым усходнім рэгіёнам Еўропы. Бо адсюль усюды простая дарога: у Варшаву, Маскву, Кіеў, Рыгу.

Вядома, пераважалі літаратурныя і мастацкія падарожжы. Ужо на пачатку ўдзельнікі „Трыялогаў" былі закінуты на старажытныя шляхі чарнарусаў. Карацей кажучы, была наладжана прэзентацыя кнігі Эўгеніюша Кабатца „Чарнаруская хроніка прокажоных".

— Мая кніжка пра драматызм беларускага патрыятызму, — кажа польскамоўны пісьменнік, ураджэнец Ваўкавыска. — Натхненнем для яе паслужыла кніжка Вольгі Грыцук „Мы стваралі сваю Беларусь". У ёй беларуская эміграцыйная дзяячка выводзіць на святло асобу Аляксея Грыцука — інспектара беларускіх школ Беластоцкай акругі ў час апошняй вайны. Аўтараў і герояў кніжак спалучаюць сямейныя сувязі. Прапаную вандроўку па чарнарускім шляху стагоддзяў. Ідзе пра рэфлексію над гісторыяй нашай зямлі.

Яшчэ да выступлення літаратара Янушам Тэрнерам была зачытана рэцэнзія на кніжку. Наконт існавання тэрміну „чарнарусы" і слова „крэсы" разгарэлася спрэчка.

— Я не баюся ні чарнарусаў, ні палешукоў, — падвёў усё Сакрат Яновіч, — бо яны раней ці пазней зліюцца ў адну беларускую плынь. Справа ў тым, што ўся беларуская ідэя пачалася з Падляшша.

(гак)

Назаўсёды засталіся беларусамі ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Даўно хочацца напісаць пра што-небудзь вясёлае і жыццярадаснае, але грамадска-палітычная рэальнасць апошнім часам не дае такіх падстаў. А тут яшчэ Беларусь церпіць канкрэтныя чалавечыя страты...

Вестка пра трагічную гібель Валеры Місюка папросту шакавала. Валеру быў толькі 31 год. Гэты яшчэ малады чалавек быў узорам сціпласці і інтэлігентнасці, прыкладам прыстойнасці і адказнасці...

„Басовішча" ў ранах ☞ 2

Ганна КАНДРАЦЮК

Слушна кажуць, каб не хваліць дня перад захадам сонца. Вазьмі і хвалі, калі ўсе ўсіх навокал хваляць! І я, не пачакаўшы да канца імпрэзы, у адным інтэрв'ю пахваліла нашу падляшскую моладзь. Праўда, гэтых самых цудоўных і прыгожых мы ведаем у твар, нярэдка яны нашы сваякі, выхаванцы або дзеткі. Яшчэ больш прыемна, калі сустракаеш такіх асоб як Мішка Грыгарук. Мішка з сябрамі прыселі да нашага стала, каб разам слухаць музыку і піць піва. Мы адразу іх палюбілі, бо яны паказаліся нам моладдзю проста з... космасу...

Другое падарожжа на Бацькаўшчыну ☞ 5

Васіль АКУНЕВІЧ

Радавы дэпутат Матвяюк? ☞ 8

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

9 770546 196000

Назаўсёды засталіся беларусамі

Даўно хочацца напісаць пра штонебудзь вясёлае і жыццярадаснае, але грамадска-палітычная рэальнасць апошнім часам не дае такіх падстаў. А тут яшчэ Беларусь церпіць канкрэтныя чалавечыя страты...

Вестка пра трагічную гібель Валеры Місюка папросту шакавала. Валеру быў толькі 31 год. Гэты яшчэ малады чалавек быў узорам сціпласці і інтэлігентнасці, прыкладам прыстойнасці і адказнасці. Мы былі знаёмыя пару гадоў і наша сяброўства толькі пачало складвацца, але адчуванне страты духоўна блізкага чалавека досыць моцнае. Валера быў простым і сімпатычным хлопцам, з якім было проста дамаўляцца пра справы, гэта быў чалавек канкрэтыкі і што называецца без падтэкстаў. Яшчэ месяц таму, у чэрвені, разам з іншымі віленцамі ён прыязджаў у вандроўку па Гродзеншчыне. Я перагледзеў фотаздымкі з нашай апошняй сустрэчы — сталі сонечныя дні і на ўсіх здымках Валера ў цёмных акулярах. Цяпер здаецца (а можа так і было!), што яго позірк быў поўным нейкай загадкавасці і аднаму яму вядомыя таямніцы. Фатальная і жорсткая смерць — Валеру забіла электрычным токам у дзень нараджэння на малой радзіме — роднай Мядзельшчыне — спыніла яго жыццё на гэтым свеце. Валера не паспеў здзейсніць сваіх планаў у Таварыстве беларускай культуры, дзе ўсе яго цанілі і шанавалі як аднаго з незаменных сябраў. Без яго цяпер ужо не рэалізаваць і многіх нашых супольных задум з віленскімі беларусамі. Не паспеў больш паўплываць на пакаленне студэнтаў (ён працаваў у Вільні выкладчыкам адной з навучальных устаноў, выдатна ведаў літоўскую мову, перакладаў з яе на беларускую і адваротна). Не паспеў стварыць нават сваёй сям'і — няма сумневу, што ён быў бы ўзорам мужа і бацькі. Кажуць, што ў кожнага чалавека на зямлі ёсць свая місія. Бог адвёў Валеру Місюку хіба толькі адну місію — паказаць якім маральным мусіць быць чалавек у грамадскім жыцці.

У Баранавічах закончыўся жыццёвы шлях легендарнага Пятра Рашэтніка, былога навучэнца Наваградскай настаўніцкай семінарыі, сябра нацыянальнага Саюза беларускай моладзі. Пазнаёміцца з ім пашчасціла ў 2000 годзе, калі ў Гродне адбылася агульнанацыянальная сустрэча ветэранаў беларускага руху — вязняў савецкіх сталінскіх канцлагераў. Нават сярод аднадумцаў і паплечнікаў-ветэранаў Рашэтнік вылучаўся сваёй мажнай паставай, нацыянальнай цвёрдасцю і такой адметнай лагоднасцю ўсмешкі. Знешне ён быў нечым падобны на пісьменніка Янку Брыля. Пятро Рашэтнік часта прыязджаў у Зэльву на Дзень памяці Ларысы Геніюш. Зазвычай са сваім сябрам, таксама вязнем савецкага канцлагера, Іванам Дуткам. Абодвух падчас знаходжання ў канцлагеры лучыла блізкае сяброўства з вялікай паэткай. Сваіх сяброў Ларыса Геніюш таксама вельмі шанавала. Яны так дапаўнялі адзін аднаго — маленькі ростам Дутка і высокі Рашэтнік. Дутка пайшоў у лепшы свет два гады таму, цяпер завяршыўся зямны шлях і Пятра Рашэтніка.

А ў мястэчку Лунна на Мастоўшчыне зусім нядаўна раптоўна памёр пенсіянер-настаўнік Віктар Дубіцкі. Спадар Дубіцкі з-за сваёй сціпласці быў ціхім і малапрыкметным, але вялікім рупліўцам нацыянальнага адраджэння. Працуючы настаўнікам, толькі па-беларуску выкладаў у школе біялогію. Выйшаўшы на пенсію, нягледзячы на хваробы, не пакінуў актыўнага грамадскага жыцця. Быў шчырым сябрам Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ. Па словах паплечнікаў Віктар Дубіцкі быў такім чалавекам, які літаральна фізічна і балесна перажываў усе праявы антыбеларушчыны, якія чыніліся і робяцца на беларускай зямлі ў апошні час. Напэўна таму і меў хворае сэрца. У адзін з момантаў яно не вытрывала...

Унікальная мемарыяльная кніга Уладзіміра Арлова „Імёны свабоды", якая мае надзвычайную нацыянальную каштоўнасць, папоўніцца цяпер яшчэ трыма лёсамі патрыётаў. Лёсамі людзей, якія не дачакаліся належнай вольнасці сваёй Бацькаўшчыны, але былі і назаўсёды засталіся сапраўднымі беларусамі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

„Басовішча" ў ранах

Слушна кажуць, каб не хваліць дня перад захадам сонца. Вазьмі і хвалі, калі ўсе ўсіх навокал хваляць! І я, не пачакаўшы да канца імпрэзы, у адным інтэрв'ю пахваліла нашу падляшскую моладзь. Праўда, гэтых самых цудоўных і прыгожых мы ведаем у твар, нярэдка яны нашы сваякі, выхаванцы або дзеткі. Яшчэ больш прыемна, калі сустракаеш такіх асоб як Мішка Грыгарук. Мішка з сябрамі прыселі да нашага стала, каб разам слухаць музыку і піць піва. Мы адразу іх палюбілі, бо яны паказаліся нам моладдзю проста з... космасу. Ужо напачатку Мішка звярнуўся да нас з просьбай:

— Ці можаце гаварыць са мной па-беларуску?

— А ты з Беларусі?

— З Кленік, хоць не зусім...

— То з Абезянава ці са Слівава?

— З Ляшчынаў, — хлапец адразу пацэліў у сук.

Фота Міры ЛУКШЫ

Ад радасці, што сустрэліся свае людзі мы замоўклі на момант. Нам было добра і прыемна, што ведаем самыя закінутыя ўрочышчы і хутары нашай малой айчыны. Краязнаўства маем у крыві. Часта думаю пра разумных дзядоў і бабуль з лакальнай картай у галаве. Ведаюць пра ўсе хутары, хто чый сваяк, хто каго трымае. Мішка таксама пахваліўся, што ў „Ніве" працуе яго цёця Марыся. Жаль толькі, што ў гэтай свойскай цудоўнасці мы адчувалі сябе быццам эмігранты. З кожнага кутка залівала нас польска-моўная хваля. Балела душа, што памірае наша нацыя з усімі сваякамі і тапанімамі. Між сабой кленіцкая моладзь размаўляе ўжо па-польску. Хоць, калі ідзе пра знаёмствы, шукае дзяўчат свойскай гадоўлі. Такой жа дзяўчынай паказалася археолаг з Уладавы. Кася — палячка з украінскімі каранямі. У яе інтэлігентных вачах свяцілася сонца Крыма. Дзяўчына патрапіла на „Басовішча" проста з экспедыцыі, дзе капалася ў скіфскіх магілах. Яшчэ больш спадабалася яе адкрытасць на беларушчыну. І яе свядомасць — дзе і чаго яна прыехала. Так як і Аркады Дроздэк, які з'явіўся... невядома адкуль. Аркады жыве „ўсюды", значыць, у Варшаве, Празе, Лондане... Хоць найчасцей ён у падарожжы. Хлапец ведае „Ніву", Сакрата Яновіча і ўсе беларускія рокменкі і растаманкі. І ведае сем замежных моў. Прозвішча Дроздэк ён атрымаў па чэшскіх продках. Таму з ходу сталі мы размаўляць на сваіх архаічных дыялектах і адначасова здзіўляліся колькі ў беларусаў і чэхаў агульнага.

— Чэшскія людзі добрыя, — паўтараў Аркадзь.

— Беларусаў таксама ўсюды хваляць! — даказвала я.

Цэлы смак у тым, што Аркадзь... паляк. Добры паляк. Хлапец уміг адчытаў вартасць сустрэчы з беларускай журналісткай. Пасля ўсё „Басовішча" ён хадзіў з беларускай кніжкай пад пахай.

Але хопіць таго дабра!

Час напісаць пра яшчэ лепшых. Менавіта, пра нашых маладзенькіх янычараў з лясных урочышчаў і мястэчак. Іх таксама магнітам цягне на беларускі фестываль. Сёлета я сама вярталася ў ранах. На мяне кінулася дзяўчына з разбітай у цюльпан бутэлькай. Знервавала яе беларуская мова:

— *Sp...ć mi do Łukaszenki!* — зараўла ледзь прытомная ад нянавісці малалетка. Як паказалася, дзяўчынка родам ад Белавежскай пушчы, з праваслаўнай вёскі. Я не даходзіла з якога яна ўрочышча. Я пашкадавала сябе. Як вядома, там, пад пушчай, усе з сабой сваякі.

Ганна КАНДРАЦЮК

Вачыма еўрапейца

Беларусь як насоўка

Часам у мяне складаецца ўражанне, што некаторыя польскія палітыкі выціраюць сабе Беларуссю вусны, з якіх выплывае паток паношаных фраз патрэбных ім у палітычнай барацьбе. Гэта проста лезла ў вушы, калі я прыслухоўваўся скандальнаму пасяджэнню сеймавай рэгламенцкай камісіі, якая мела адхіліць імунітэт былому міністру юстыцыі Збігневу Зёбру і пазнейшай пленарнай дыскусіі ў гэтай справе. І цяжка не пагадзіцца з падляшскім дэпутатам Яўгенам Чыквіным, які з сеймавай трыбуны заклікаў, каб у публічных выступленнях парламентарыі „не абражвалі, не прымянялі зняважлівых слоў у адносінах да суседніх з намі краін і народаў". Далей дэпутат Чыквін казаў (прыводжу тэкст за стэнаргамным запісам пасяджэння):

— Учора не адзін раз у адмоўны спосаб тут выкрыквалі: „Białoruś, na Białoruś!". Вядома, існуе дзяржава Беларусь; у беларускага народа ёсць свая дзяржава, якой не было ў яго шмат соцень гадоў. Яна недасканалая, кіруюць ёю аўтарытарна, але гэта каштоўнасць вяшэйшая ўсяго для беларускага народа і рашучая большасць беларускага народа з ёю ідэнтыфікуецца і ёю ганарыцца. Вядома, стандарты, якія вы прадставілі ўчора, яшчэ ў ёй не прымяняюцца, але (весялосць у зале, апладысменты) я не думаю, што былі мы ўчора ўзорам у будаванні беларусамі дэмакратыі.

У сеймавай сварцы дасталася таксама ўкраінцам. Яўген Чыквін напамінаў пасля:

— Я хацеў бы таксама асабіста прасіць у пана маршалка Камароўскага — ён гісторык і сапраўды, калі ён хоча адмоўныя прыклады паводзін знайсці ў гісторыі, пачынаючы з тумультаў, з бігасавання, не мусіць спасылацца на казацкую сеч. Ідэя казаччыны, казацкай сечы для ўкраінскага народа вельмі пазітыўная. На ёй між іншым будуецца нацыянальная ідэнтыфікацыя ўкраінцаў.

Так няўдачна склалася, што сеймавая спрэчка, са зняважлівымі выкрыкамі з Беларуссю на заднім плане, адбылася ў той час, калі ў Мінску працягваўся чарговы раунд консульскіх кансультацый наконт дамовы аб малым памежным руху паміж РП і РБ. Наколькі ведаю, скандал у Сейме ніяк не паўплываў на ход мінскіх перамоў, але таксама не спрыяе г.зв. добрай атмасферы ў абмеркаванні гэтай справы і іншых пытанняў, звязаных з польска-беларускім супрацоўніцтвам.

Лозунгі, выкрыкваныя дэпутатамі наконт Беларусі, кранаюць — як гэта, дарэчы, акрэсліў дэпутат Чыквін — беларускі народ. Гучалі яны як папулярныя ў некаторых асяроддзях, таксама палітычных, быццам бы зняважлівыя мянушкі: „Ty, Żydu", „Ty kacapie" і да г.п. Польскія палітычныя эліты не будуць магчы разлічваць на зразуменне ў Еўропе і ў свеце, калі іх ружжом стане прыніжанне іншых грамадстваў, народаў, дзяржаў.

Вернемся яшчэ да дамовы ад малым памежным руху. Пісаў я нядаўна ў „Ніве" аб тым, што Еўрасаюз загадаў Польшчы і Украіне рэнегацыяваць падобнае паразуменне. Тым часам незалежна ад таго факта, камісар ЕС па знешніх адносінах і палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднэр прадбачыла пачатак дыялогу з Украінай на тэму адмянення візавага рэжыму. І ў гэтым кантэксце падумаў я аб Беларусі, перад якой яшчэ вельмі доўгая дарога да такіх размоў. Некаторыя польскія палітыкі, што раскідаюцца такімі паняццямі як свабода ці дэмакратыя, адначасова абразліва прымяняючы Белую Русь, не памогуць беларускаму народу ў пошуках свайго месца ў Еўропе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Раз на возе, раз пад возам

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

(заканчэнне; пачатак у 29 нумары)

Гаспадары, якія пры народнай уладзе гадавалі больш свіней, кароў або авечак, атрымлівалі прыстойны заробак за цяжкую працу, пра што не раз успамінаюць у размовах. У дзевяностых гадах асабліва рэзка панізілася рэнтабельнасць авечкагадоўлі, што вельмі моцна абмежавала вытворчасць воўны і шкур. Гаспадары, якія паменшалі авечыя статкі, прыбытак атрымлівалі ў галоўным ад продажу ягнят на экспарт у Італію, Германію і Францыю. Пры гадоўлі невялікай колькасці кароў, гусей, ці авечак, незалежна ад працяглай дрэннай кан'юнктуры, засталіся найчасцей тыя земляробы, якія гаспадарылі на землях дрэннай якасці.

На вачах гіне гадоўля авечак. У мінулым Пётр Галімскі гадаваў пад 120 штук, а зараз асталося больш за 20 аўцаматак і бараноў

На вачах гіне гадоўля авечак

Нашы земляробы — людзі выносліывыя. Авечкагадоўцы, з прыходам у дзевяностых гадах горшай кан'юнктуры, паменшалі статкі і хацелі перачакаць нядобры час. Хаця наракалі, што не купляюць ад іх воўны або плацяць за яе сімвалічную залатоўку, што моцна ўпала цана шкур і дарослых авечак, пацяшалі сябе, што могуць яшчэ за прыстойную цану прадаваць ягнят. Пасля стала падаць і цана ягнят, што з аднаго боку выклікала роспач, а з другога — бяссілле.

— У мінулым я гадаваў нават па 56 аўцаматак, а разам з баранамі і ягнятамі было ў мяне нават 120 штук авечак. Яшчэ пры народнай уладзе добры прыбытак быў ад продажу воўны, шкур, добра плацілі за аўцаматак і ягнят. Пасля сталі прывозіць танную воўну з Аўстраліі і Расіі. Быў перыяд, што ўвогуле не аплачвалася прадаваць воўну. Я нават хацеў дамешваць яе да гною і раскідаць па полі, але закручвалася яна ў матавілы. Перасталі таксама купляць шкуры, а старых авечак бралі амаль дармова. Прыбытак астаўся толькі ад ягнят на экспарт, — тлумачыць Пётр Галімскі з Ягаднік.

Яшчэ гадоў дваццаць таму толькі ў саміх Ягадніках гадавалі больш за 500 авечак. Буйныя авечкагадоўцы былі ў Пасечніках і Старым Корніне, а меншыя статкі земляробы трымалі практычна ў кожнай вёсцы. З цягам часу сталі яны абмяжоўваць або ліквідаваць гадоўлю.

— Зараз за кілаграм воўны плацяць 1,99 зл. З адной стрыжкі можна атрымаць толькі 3,5-4 кілаграмы воўны ад адной авечкі. Старых авечак перасталі браць на скупках і зараз можна прадаць іх толькі на мяса індывідуальным пакупнікам. Нават агратурыстычныя кватэры патрабуюць толькі ягнят. Калі з глыбі Польшчы прыязджаюць пакупнікі за старымі авечкамі, то плацяць па 2-3 злоты за кілаграм вагі. Кажуць, што кормяць імі сабак. Калі нават 7-8 гадоў назад я гадаваў па 70-80 авечак, за ягня вагой пад 26 кілаграмаў плацілі па 220 злотых, а літр дызпаліва тады каштаваў звыш 2 злотых. Цяпер за такое ж ягня плацяць па 140 злотых, а літр дызпаліва каштуе пад 5 злотых, — расказвае Пётр Галімскі. — Заняпад гадоўлі авечак прыйшоў гадоў 3-4 назад. Тады з 46 маіх авечак палову я прадаў. Яшчэ і зараз гадую больш за 20 авечак, але пачакаю ажно аўцаматкі акоцяцца і тады канчаткова зліквідую гадоўлю авечак на продаж. Хачу пакінуць 5 аўцаматак, каб была бараніна для сябе і знаёмых. Догляд за імі будзе маім самым любімым заняткам, з якім я вельмі звыкся ў час гападарання.

Адбіваюцца ад дна гадоўцы свіней, але ці надоўга?

Калі рыначная эканоміка ўвайшла ў сельскую гаспадарку, самымі непрадбачнымі былі цэны свініны. Пастаянныя падзенні, а пасля невялікія павышэнні цэн вельмі нервавалі свінаводаў і ў многіх выпадках былі прычынай ліквідацыі гадоўлі свіней на продаж. Буйныя гаспадары, якія ў велізарных аборах гадавалі тысячы штук свіней, не мелі магчымасцей хутка пераставіцца на іншую прадукцыю і разлічвалі, што прыйдзе лепшая кан'юнктура. Аднак былі выпадкі, калі судовыя выканаўцы прадавалі частку палёў або сельскагаспадарчыя машыны свінаводаў, каб пагасіць іхнія даўгі ў банках.

Многія свінагадоўцы пакінулі па 2-3 штукі на свае патрэбы

— Я гадаваў нават па 20-30 свіней у год, а раней здаваў нават па 40 маладых самак, якіх пасля куплялі свінаводы, але 3 гады назад ліквідаваў нерэнтабельную гадоўлю, калі яшчэ плацілі па 2,7-2,8 зл. за кілаграм. Зараз прыйдзецца разбіраць непатрэбны хлеў, — кажа Пётр Галімскі з Ягаднікаў. — Гадую толькі некалькі свіней на свае патрэбы.

— Яшчэ восенню мінулага года ў Дубічах-Царкоўных плацілі за свініну ніжэй 3 злотых за кілаграм, а пару парасят можна было прадаць на рынку ў Кляшчэлях толькі за 170 злотых, — кажа Антон Мрук з Тапароў.

Восенню падаражэла збожжа і прадукцыя свініны стала зусім нерэнтабельнай. Многія гаспадары рашыліся моцна абмежаваць гадоўлю свіней на продаж і свінаматак для продажу парасят. Аднак у апошнім перыядзе найбольш пацярпелі буйныя свінагадоўцы, якія ў вялікай ступені абапіраюць сваю гадоўлю на збожжы, якое купляюць ад навакольных сялян.

Толькі нядаўна прыйшло моцнае павышэнне цаны свініны, што зрабіла яе прадукцыю рэнтабельнай пры ўмове, што гадуецца вялікая колькасць свіней, напрыклад, дзве тысячы штук.

— У Рэпніках, што за Заблудавам, плацяць зараз па 4-4,19 зл. за кілаграм свініны, але трэба яшчэ палічыць транспарт. Звычайныя гаспадары, якія гадуюць невялікую колькасць вепрукоў, найчасцей прадаюць іх пасрэднікам, якія, зразумела, плацяць менш чым на скупцы ў Рэпніках, — кажа Пётр Галімскі.

— У Дубічах-Царкоўных хіба мы яшчэ не атрымаем 4 зл. за кілаграм свініны, але за пару парасят у Кляшчэлях плацяць ужо і па 200 злотых, — дабаўляе Антон Мрук. — За пару парасят на гайнаўскім рынку можна атрымаць нават і звыш 200 зл.

Не задавальняюць перспектывы вытворчасці ялавічыны

На рынку ялавічыны цэны больш стабільныя чым на рынку свініны. Аднак цэны ялавічыны не задавальняюць маіх суразмоўцаў, якія ў галоўным настаўлены на вытворчасць малака. Сродкі ад продажу часткі цялят (астатніх цёлак пакідаюць гаспадары для пабольшання статка) і аднагадовых ці двухгадовых бычкоў толькі папаўняюць іх бюджэты, якія ў галоўным складваюць даходы ад продажу малака. Цяжка будзе Павятоваму сельскагаспадарчаму дарадчаму калектыву з Гайнаўкі пераканаць гаспадароў, каб падумалі аб крыжаванні парод і паспрабавалі гадаваць мясных кароў.

— Калі гаварыць пра цялят, дык за цёлак плацяць па 6-6,5 зл. за кілаграм, а за бычкоў — па 8-9 зл. Аддаючы старых кароў на мяса можна атрымаць па 3-4 зл. за кілаграм, а за маладыя ялоўкі плацяць 6-6,5 зл., — пералічвае Уладзіслаў Нічыпарук з Чыжык, які ў галоўным настаўлены на вытворчасць малака (прадае ён на мяса толькі тое быдла, якое не падыходзіць да малочнага статка).

— У мінулым я гадаваў па 10-12 свіней і па некалькі бычкоў на продаж. Зараз свіней гадуем толькі на свае патрэбы. Гадоўля бычкоў стала нерэнтабельнай, калі ўлічыць высокія цэны збожжа, — гаворыць Расціслаў Федарук з Вітава.

— Яшчэ год таму за бычкоў можна было атрымаць нават па 11-12 злотых за кілаграм, а зараз цана іх упала. Затое падаражэлі ялоўкі, а цана двухгадовых бычкоў, за якія плацяць пад 5 злотых за кілаграм, і старых кароў трымаецца на падобным узроўні як і раней, — кажа Антон Мрук з Тапароў.

Рэнтабельнасць прадукцыі ялавічыны моцна панізілася з-за павышэння цэн збожжа і намнога вышэйшых цэн дызпаліва, мінеральных угнаенняў і сродкаў аховы раслін.

Цяжка зараз прадбачыць цэны хатняй жывёлы, якія будуць прапанавацца за некалькі месяцаў. Аднак праз некалькі гадоў яны могуць павысіцца з-за штораз большага запатрабавання на мясныя вырабы ў краінах, у якіх наглядаецца паскоранае гаспадарчае развіццё, напрыклад, у Кітаі. Можна было б экспартаваць нашы мясныя вырабы менавіта ў Кітай, але масавы экспарт гэтых прадуктаў у далёкую краіну тармозяць высокія кошты транспарту ў рэфрыжэратарах. Гаварылася нават пра ўстанаўленне прамой чыгуначнай сувязі паміж Польшчай і Кітаем, а ў адпаведных вагонах-халадзільніках хутчэй, чым на машынах або марской дарогай, можна было б вазіць кітайцам таксама і мясныя прадукты.

Паказчыкі вярнуліся на старое месца

Апрача аналізаў, якія праводзяць самі земляробы, маем таксама даследаванні Інстытута эканомікі сельскай і харчовай гаспадаркі, якія былі апублікаваны толькі 4 ліпеня 2008 года. Паводле гэтых даследаванняў, у якіх за падставу быў прыняты 1995 год, дынаміка рэальных даходаў гаспадароў падала з 1995 года ажно да 2003-2004 гадоў. Тады рэальныя даходы гаспадароў былі ў сярэднім ніжэйшыя ад рэальных даходаў 1995 года ажно на 25%. Пасля пачаўся рост рэальных даходаў і ў 2007 годзе былі яны вышэйшымі ад даходаў 1995 года на 6%.

Каму выгадней?

У Беластоку працуе некалькі купальных басейнаў, якія знаходзяцца ў арганізацыйных структурах Гарадскога асяродка спорту і рэкрэацыі. Карыстальнікамі басейнаў з'яўляецца школьная моладзь, таму можна імі карыстацца адно ў навучальным годзе. Каб прапісацца на заняткі, трэба было адстаяць свой час у чарзе, практычна — некалькі дзесяткаў гадзін. Людзі вымушаны былі прыходзіць на начныя дзяжурствы так, як гэта бывала пры камуне за дэфіцытным таварам. Найбольшым поспехам карыстаецца, зразумела, басейн у цэнтры горада па вуліцы Влукеннічай. Дагэтуль дзеткі, якія карысталіся абанементам на працягу двух сезонаў (выкупілі восем карнэтаў запар), мелі магчымасць карыстацца купальняй на наступны год. Апошнім часам памянялася кіраўніцтва, прытым перамяніліся і законы на Влукеннічай. Зараз будзе праводзіцца інтэрнэтавая прапіска карыстальнікаў. Кошт двухмесячнага абанементу на басейн для дзетак складае суму 120 зл. (у сезоне — 600 зл.) і для старэйшых (вялікі басейн) адпаведна: 208 і 1040 зл. Што паўплывала на такія перамены, цяжка сказаць. Адно пэўнае, ліквідуецца чаканне ў чарзе на прапіску. Каму затым спатрэбілася такая здзелка? Лічу, што не грамадству. Інтэрнэтавая прапіска абмяжуе раўнамерны доступ да купальні дзеткам, бо не кожны жыхар Беластока карыстаецца электроннай поштай. Будуць затым „лепшыя" і „горшыя". Ды і статут набору яшчэ невядомы. Якімі крытэрыямі пакарыстаецца адміністрацыя купальні пры падборцы кандыдатаў на сезон 2008/2009, цяжка сказаць. На маю думку, правілы павінны быць загадзя вядомымі жыхарам горада. Дазволіць гэта абмежаваць паталагічныя з'явы — кумаўство і карупцыю. Можна спадзявацца, што ўсё будзе праходзіць згодна з літарай закона. **(ус)**

Гайнаўка

Вуліцы

Зараз у Гайнаўцы пачаліся працы пры перабудове і пабудове вуліц. Цяпер найбольшы рух па вуліцы Паркавай і на скрыжаванні вуліц Арміі Краёвай, Белавежскай ды Паркавай. На вуліцы Паркавай кладуць новыя бардзюры, перабудоўваюць тратуар, кладучы брусчатку на новай аўтастаянцы. На скрыжаванні вуліц Белавежскай і Паркавай пешыя ходзяць па новым тратуары.

Добра сталася, што сёлета пабудуюць новыя маставыя на вул. Фабрычнай (яе 450-метравы пясчаны, ухабісты адрэзак) ды на вул. Партызанскай.

Пакуль што яшчэ нічога не робіцца на запланаваных сёлета да аднаўлення гарадскіх вуліцах 11 Лістапада (яна з'яўляецца павятовай дарогай) і Стралецкай.

* * *

Новыя лавачкі паставілі па вул. Баторыя і па вул. Пілсудскага ў Гайнаўцы. Гэта прыемная неспадзяванка зараз, у разгар лета. Цяпер па вуліцах прагульваецца найбольш людзей. Лавачкі патрэбныя, а ўжо найбольш састарэлым. Моладзь таксама падчас летніх канікул любіць пасядзець у кампаніі. Лавачак будзе яшчэ больш. Улады Гайнаўкі чакаюць прапаноў жыхароў горада, дзе было б найлепш іх паставіць. Некаторым не даспадобы мець іх у сябе каля блока пад вокнамі. **(яц)**

ПА-СЯБРОЎСКУ, У ФЕЕРВЕРКАХ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Гарадок гуляе ўсё лета. Мерапрыемствы, арганізаваныя пры падтрымцы еўрапейскіх фондаў (раней) і перш за ўсё Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ды спонсараў патрабуюць ад арганізатараў выказацца ўласнай крэатыўнасцю ды ўмеласцю добра распарадзіцца грашыма. Патрэбная тут перш за ўсё іх, арганізатараў, уласная ініцыятыва і трапны праект, які мог бы стаць падставай цікавага і карыснага ў еўрапейскім сэнсе мерапрыемства. І Гарадок умела выкарыстоўвае свае козыры, пазбыўшыся „шапак", якія хутчэй цалкам прысабечвалі сабе поспех, не наймацней пасабляючы ў арганізацыі. Вядома, там дзе відны поспех, там і будучыя спонсары, і прамоцыя ўсяе грамады. І Гарадок на гэтым сямейным свяце — шматлюдным, культурным, няхітрым пікніку — зарабляе найбольшую славу.

— Ужо дзевяты год мы ўжо ганарымся гэтым, — пачынае войт Гарадоцкай гміны Веслаў Кулеша 26 ліпеня на „Сяброўскай бяседзе", — што ў нас адбываецца гэтае мерапрыемства. Яно дае нам магчымасць запрасіць да нас гасцей, калектывы, і з Беларусі, і з іншых бакоў. Мы хочам паказаць нашу гасціннасць, перш за ўсё поспехі нашых беларусаў, усю Гарадоцкую гміну, таксама і наймалодшых — дзяцей, моладзь. З'яўляюцца на „Бяседзе" цэлыя сем'і, іх сваякі і сябры. Наладжваюцца таксама новыя знаёмствы.Таксама паміж калектывамі з розных мясцовасцей, гмін, гарадоў, што пасля прыносіць плён у супрацоўніцтве. Наша імпрэза мае прагрэсіўны характар, з году ў год буйнее. Міністэрства сёлета падмацавала нас трыццаццю пару тысячамі. Вядома, мы таксама не маглі паскупіцца на гэтае вялікае свята, якое найбольш відна, апрача „Басовішча", паказвае нашу гміну.

Сабраныя тысячы гасцей прывітаў ад „свае сям'і", засеўшай за гасцінным доўгім сталом на сцэне, дырэктар гміннага цэнтра культуры — дома культуры імя Кастуся Каліноўскага ў Гарадку Юрка Астапчук. Сам пералік саноўных гасцей зойме пару песень! Ды гонар і для гміны, і для гасцей-гледачоў, што гэтую радасную сустрэчу пад пагодлівым небам ушанавалі ўладныя і шаноўныя госці, якія прыйшлі ж таксама сюды не з самога абавязку прадстаўляння ці выбарчай нагоды. Ну і — „Паехалі!" Пляскаем у ладкі! Гімн сяброўскай бяседы спяваюць усе: „Гэй, сяброўская бяседа, гуляць трэба сёння нам!" На ражнах верцяцца парасяты, дым з вогнішчаў, адмысловы каляровы туман са сцэны, іскры феерверкаў яшчэ і ў белы дзень... Шчыльна набітыя лавачкі, на палянках вакол пляца — густа раскладзеныя пледы і радзюжкі з вясёлымі сямейнымі і сяброўскімі групамі. Вітаюцца землякі! Да валілаўскай настаўніцы-пенсіянеркі Ліды Паплаўскай (бабуля рокмена з „РІМЫ" Андрэя) прыпалі яе вучні. Часам ледзь распазнаць хто бяжыць з буськамі! Вось тут аднакласнік Лёніка Тарасэвіча Пятро Сац. Што рабіў за гэтыя гады, каго бачыў? Перакрыкваць часам трэба і гоман, і музыку, што ляцяць са сцэны. А песні не спыняюцца. Пачаў „Расспяваны Гарадок". Рэй вядуць калектывы з Гарадоцкай гміны, яны ж і гаспадары. І „старыя", як згаданы, якому ўжо 55 гадоў, і маладзейшы, бо дзесяцігадовы хоць у большасці сівагаловы „Асенні ліст", і „Хутар", і залучанскія „Каліна" з „Калінкай". Маладая і бадзёрая, прыгожая „Калінка" бярэцца пасля за сваю прамоцыю: хочуць выдаць кружэлку з песнямі, якой чакаць можна толькі мураванага поспеху. Фіксуем: і няма як ужо адмовіцца спонсару — фірма *Sambor — E i B. Borowscy* абяцала пасобіць дзяўчатам пад кіраўніцтвам Марыюша Харужага. Магутныя галасы вялікіх хароў з Гайнаўкі ды Бельска „Васілёчкі" і „Куранты" асабліва гожа і ўзнёсла ляцяць па-над соснамі ўрочышча Барык. І дзіцячыя галасы з гарадоцкай „Казкі" ды першы раз вучняў праваслаўнай пачатковай школы ў Беластоку (пры падтрымцы „Прымакоў") захапляюць і цешаць: расце малады гурт любіцеляў роднай песні. І ўсе найлепшыя: і з Беларусі — шчучынскія „Медуніцы", бярозаўскія „Шкляры", „Белыя зоры", нашы „Арляне", „Чыжавяне", „Цаглінкі"... Фальклор і эстрада. „Ас", „Прымакі", „Вясна", „Сказка", „Аўра"... Проста — другі раз фестываль беларускай песні, адно неяк больш натуральна: сярод векавых дрэў, з „інтэрактыўнымі" слухачамі, якія таксама не мусяць шкадаваць голасу і хай і выкрычаць словы ад малога вядомых песень. Для добрага духу, і для цела таксама: гурты нясуць смачнае на супольны бяседны стол, а найлепшыя майстрыхі кухні — свае тутэйшыя вырабы. Першай у кухні аказваецца быць Міраслава Антановіч, шэфіха Гуртка вясковых гаспадынь у Гарадку, спявачка з „Асенняга ліста", у якой хаце — аграгасцініца. Перамагло смакоцце пані Міркі: піражкі-паштэцікі з капустай і грыбамі ды печаныя бульбяныя галушкі з мясам. Да III узнагароды пані Марыі Парэмбскай дакладаюся з гонарам і я: дзяру вядро маладой бульбы на пераможную бабку! Маю сціплую натугу фільмуе на падворку Парэмбскіх у Валілах-Станцыі гродзенскае тэлебачанне, якое запісвала эцюд пра пашага паэта Анатоля Парэмбскага. Меркавалі: я сваячка Парэмбскіх. Так-так, сваячка па „Ніве"!

Павел Латушка - пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы дае інтэрв'ю „Радыё Рацыя"

Цешацца людзі свойскай песняй, што ляціць са сцэны аздобленай кветкамі і снапамі (72 накасіў іх паэт), турбуюць іх свойскія справы.

— Ты мне скажы, ці то праўда, — пытаецца пан Пётр, які прывёз калектывы з Нараўчанскай гміны, — вы ў „Ніве" ведаеце. — Ён родам з-пад Ружан. У Мацеюкоў там хатка засталася. Хацелася б проста заехаць туды, падзівіцца, і не як чужы-іншаземец. Хоць бы на тым месцы палатку паставіць, пабыць, дакрануцца роднай зямлі. — Я чуў, што мае быць Карта беларуса. Вы там высветліце, з чым гэта мелася б вязацца. Можа, спытацца ў пасла Беларусі?

Пасол Рэспублікі Беларусь вядомы ў Гарадку здаўна.

— „Сяброўская бяседа" — гэта вельмі цудоўнае свята, якое заўсёды прыцягвае. Шчыра кажу: я быў у Мінску і сёння ўначы прыехаў у Гарадок спецыяльна дзеля таго, каб быць чарговы раз на сяброўскай бяседзе, — і адказ на пытанне, якое турбуе не аднаго беларуса з абодвух бакоў мяжы: пра малы памежны рух: — Так, сапраўды, у Мінску ў мінулы чацвер абыўся чарговы раунд перагавораў паміж міністэрствамі замежных спраў Беларусі і Польшчы. Галоўнай тэмай перамоў была справа падпісання пагаднення аб паездках памежнага насельніцтва. Гэта даволі важны дакумент, у якім зацікаўлены і беларускі, і польскі бакі і я пацвярджаю пазіцыю беларускага боку як мага хутчэй заключыць гэтае пагадненне. Зразумела, што пагадненне тычыцца шмат мільёнаў грамадзян Польшчы і Беларусі. Падчас яго ўзгаднення ўзнікае шмат тэхнічных складанасцей, звязаных з неадпаведнасцю заканадаўстваў Беларусі, Польшчы і Еўрапейскага Саюза. Ёсць даволі шмат тэхнічных вымаганняў з боку Еўрапейскага Саюза, якія павінны быць уключаны ў гэтае пагадненне. Гэта на сённяшні дзень галоўныя складанасці. Мы працуем над імі, мы іх ужо акрэслілі, з аднаго і другога боку, узялі чарговую паўзу, каб іх вырашыць. Мы ўпэўнены, што знойдзем выхад з сітуацыі і пагадненне будзе заключана і да канца года ўступіць яно ў сілу. Але для гэтага, зразумела, патрэбная воля двух бакоў.

Ды не проста „насельніцтва" тут жыве, і тое, што прыехала на свята. Такая надзея.

Другое падарожжа на Бацькаўшчыну

Тэкст і фота Васіля АКУНЕВІЧА

Мінск

12 і 13 ліпеня мы, сябры Таварыства беларускай культуры ў Літве, знаёміліся з гісторыяй і сучасным жыццём Беларусі. Цікавую гістарычную экскурсію па Мінску і ва ўрочышча Курапаты правёў для нас Аляксей Фралоў. Спадар Аляксей — прафесійны музыка, выкладчык у Акадэміі музыкі — цудоўна ведае гісторыю Мінска, актыўна ўдзельнічае ў ахове архітэктурнай спадчыны сталіцы Беларусі. З ім мы хадзілі па Верхнім горадзе, па старых вуліцах Койданаўскай, Феліцыянаўскай, Вялікай Зборавай, Францысканцаў і іншых. Слухалі аповед і глядзелі старыя малюнкі і карты-схемы былых Езуіцкага і Бернардзінскага кварталаў. Знаёміліся з гісторыяй кляштараў і іншых будынкаў, якія дажылі да нашых дзён і цяпер выкарыстоўваюцца для агульных патрэб. Так, езуіцкі касцёл пачатку XVIII стагоддзя — цяпер кафедральны касцёл, былы мужчынскі кляштар — цяпер праваслаўны кафедральны сабор, дом масонаў (канец XVII ст.) — цяпер Музей тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, дом мастака Ваньковіча — цяпер філіял Нацыянальнага мастацкага музея.

Трэба зазначыць, што згаданым будынкам пашанцавала. Яны аднаўляюцца, рэстаўруюцца, сваёй прыгожай архітэктурай, дэкорам і фрэскамі сведчаць аб тым, якой багатай і заможнай дзяржавай была наша краіна ў тыя вякі. Другім гістарычным будынкам пашанцавала менш. Яны дажылі да нашых дзён, але выкарыстоўваюцца не зусім па прызначэнню. Жаночы кляштар, як і мужчынскі, пасля захопу маскоўцамі ў канцы XVIII ст. быў зачынены, царскімі загадамі прыстасаваны пад вязніцу, бальшавіцкім рэжымам прыстасаваны для склада — сховішча кніг, і сёння застаецца быць складам. Спадзяемся, што хутка прыйдзе чарга для рэстаўрацыі і гэтага помніка сярэднявечча.

Радасна было хадзіць па залах новага корпуса Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. У залах гэтага корпуса нам пашчасціла паглядзець экспазіцыю слуцкіх паясоў. Слуцкія паясы прызнаныя ва ўсім свеце нацыянальнай рэліквіяй беларускага народа як унікальны від ручнога ткацтва і сімвал самавызначэння нацыі. Выстава слуцкіх паясоў са збораў Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь адчынена 5 траўня. Там жа, у новым корпусе музея выстаўлены працы мастакоў Беларусі XVII-XXI стагоддзяў.

Курапаты

Абавязковым пунктам нашай вандроўкі ў Беларусь былі Курапаты. Народны мемарыял Курапаты займае асаблівае месца ў беларускай гісторыі і культуры. Там знаходзяцца ўлікі злачынства генацыду, які ў 1937-1941 гадах рабіў над беларускім народам камунізм. Сотні тысяч замучаных у вязніцах Беларусі былі прывезены ў гэтае месца і расстраляны. Адтуль, з Курапат, пачалося ў 1988 годзе нацыянальнае адраджэнне Беларусі, якое прывяло да ўтварэння Беларускага народнага фронту, да прыняцця Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі ў 1990 годзе, да абвяшчэння незалежнасці Беларусі 25 жніўня 1991 года. Споўнілася 20 гадоў як беларускі народ і ўвесь свет даведаліся пра злачынствы ў Курапатах. 20 гадоў беларусы шануюць гэтае месца. Траім з нас не давялося

Перад кафедральным саборам

Ускладанне кветак да крыжа ў Курапатах

У музеі Анатоля Белага

раней наведаць Курапаты. Таму мы наведалі іх, паклалі бел-чырвона-белыя кветкі да крыжа пакутнікаў. Там мы засталі людзей, якія ладзілі талаку па ўпарадкаванні мемарыяла. Талаку вёў Уладзімір Станіслававіч Юхо. На нашу просьбу талакоўцы пагадзіліся сфатаграфавацца з намі. Ад іх мы даведаліся што ў той дзень, перад намі, мемарыял наведалі дэлегацыі ад пасольстваў ЗША і Польшчы. Гэта яшчэ адно сведчанне той асаблівай ролі, якую займаюць Курапаты ў Беларусі.

Старыя Дарогі

У гэтае мястэчка за 140 км на поўдзень ад Мінска мы прыехалі каб наведаць прыватны музей беларускага нацыянальнага мастацтва Анатоля Белага. Спадар Анатоль Белы — прафесар, выкладчык Дзяржаўнага універсітэта, адзін са стваральнікаў і кіраўнік мастацкага клуба „Спадчына" — прафесійна ведае музейную справу і за свой кошт пабудаваў будынак музея, сабраў калекцыю мастацкіх твораў, а ў 1999 годзе адкрыў музей. 500 квадратных метраў выставачнай плошчы, 8 залаў, у якіх выстаўлена 1700 твораў, і 3000 твораў у запасніках. Гэтыя лічбы робяць уражанне. Мы пераканаліся, што варта было нам ехаць сюды з Вільні. Мы пабачылі выставу, пераканаліся ў яе унікальнасці. Падзівіліся мы на вялізную працу па зборы твораў мастацтва, будаванню будынка музея, арганізацыі яго дзейнасці і падрыхтоўцы экспазіцый. Але галоўнае, мы пазнаёміліся з апантаным беларусам, які ахвярна робіць патрыятычную справу на карысць Бацькаўшчыны. Працаголік Анатоль Белы здолеў далучыць да дзяржаўнай значнасці справы сваю сям'ю — жонку і дачку ды шмат мастакоў і другіх падзвіжнікаў.

„Любіць Радзіму, шанаваць родную мову, захоўваць спадчыну. Анатоль Белчырвонабелы" — шыльда з такім лозунгам на ўваходзе ў музей як найлепей тлумачыць тое, што здольны зрабіць чалавек, для якога гэта не лозунг, а сэнс жыцця. У экспазіцыі музея сабраны творы сучасных мастакоў. Надворак музея адданы дзеячам нашай гісторыі і культуры. Скульптурныя помнікі бацькі і сына Багдановічаў, К. Каліноўскага, калектыўны помнік заснавальнікам БНР, Л. Геніюш, Н. Арсенневай, М. Ярмаловічу, М. Улашчыку, і іншым. У першым зале — мастацтва народнага мастака Л. Шчамялёва, плеяды мастакоў Ціхановічаў. Другая зала прысвечаная гісторыі. Тут „Радавод полацкіх і вялікіх літоўскіх князёў", аўтар А. Белы. Трэцяя зала поўніцца творамі Аляксея Петрухны. Чацвёртая зала прысвечана В. Быкаву. Ёсць некалькі мастацкіх твораў самога Васіля. Пятая зала прысвечана клубу „Спадчына". Шостая зала керамікі і скульптуры. У галоўным працы кераміста М. Несцяровіча. Сёмая зала графікі і медальернага мастацтва. Восьмая зала „Змагарная Беларусь" — пра пяць паўстанняў, дзве вайны.

Падарожжа было паспяховым, дзякуючы клопату мінскіх сяброў спадара Хведара Нюнькі. Яны нас сустракалі, шчыра і сардэчна прымалі ў сваіх сем'ях і частавалі дамашнімі стравамі. Так мы пабачылі не адно гісторыю нашай Бацькаўшчыны, але таксама і сучаснае жыццё нашых землякоў.

У чыім інтарэсе?

Хацеў я на Пятра і Паўла паехаць на магілу свайго бацькі і брата, але не атрымалася. Восем кіламетраў гэта недалёка, але мне, інваліду першай групы, гэта надта далёка, каб пайсці пяшком. Па суботах з Беластока ў Падазяраны не ездзіць ніводзін аўтобус ПКС. Вёскі, распаложаныя паабапал гэтага маршруту, адрэзаныя ад навакольнага свету. У нядзелю амаль тое ж самае — у Міхалова даедзеш, а далей — дуля з макам. Тут нават і прыватныя аўтобусы не ездзяць!

Падумайце, ці ў дэмакратыі ўлады так павінны дбаць пра людзей! Пан Яраслаў Качынскі кажа, што ў нас такі непарадак як у Беларусі. А я кажу, што менавіта ў Беларусі парадак, а не ў Польшчы.

У непарадку з аўтобусамі вінаватыя гмінныя ўлады. Гміна ў час летніх канікулаў магла б у выхадныя дні паслаць школьны аўтобус па вёсках, каб жыхары мелі магчымасць дабрацца ў гмінны цэнтр. Але каму гэтым хочацца займацца? Гмінныя чыноўнікі ў першую чаргу дбаюць пра свае заробкі! А ты, старэча, калі не дасі рады хадзіць і не маеш на чым ездзіць, сядзі і маўчы. У Міхалове рыхтуецца святкаванне стогадовага юбілею праваслаўнага прыхода. Можа неяк дабяруся ў царкву падзякаваць Богу за такую дэмакратыю, якую нам паслаў. Па грэчаску слова дэмакратыя абазначае ўладу люду. Аказваецца, што ў нас гэта зусім не так.

Калісь Шэршань у „Новай дарозе" пісаў так: „Янкель грошыкі счытае, а калхознік галадае". Так і цяпер: адзін бярэ 60 000 зл. штомесяц (пра гэта нядаўна пісала газета „Факт"), а другі — 600 зл. Такім панам так і жыць, а мне застаецца толькі пісаць.

Дзядзька ЗАХАР

Чэрвеньская імпрэза ў ТБК

28 чэрвеня адбылася чарговая імпрэза, прысвечаная памяці відным беларускім дзеячам і падзеям. Старшыня ТБК Хведар Нюнька нагадаў прысутным пра публікацыю Зянона Пазьняка і Яўгена Шмыгалёва „Курапаты — дарога смерці", якая выйшла роўна 20 гадоў таму і глыбока ўскалыхнула беларускую грамадскасць злачынствамі бальшавізму на беларускай зямлі.

Мінула 5 гадоў, як не стала вялікага пісьменніка і беларуса Васіля Быкава. Дакладчык нагадаў пра творчасць пісьменніка, а таксама, пра паховіны ў Мінску, дзе на магілу В. Быкава дастаўлены быў вянок ад ТБК Літвы.

Дакладчык распавёў таксама пра жыццё і грамадскую дзейнасць беларускага патрыёта Вацлава Іваноўскага, забітага бандытамі. З родам Іваноўскіх Хведар Нюнька быў асабіста знаёмы.

У выступленні Андруся Старавойтава была тэма працы на радыё „Палёнія" і „Панараме" Белсата.

У заключэнне быў паказаны фільм пра манаха Жыровіцкага манастыра інака Міколу (Алега Бембеля — „Зніча").

Фелікс

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Проста КАЗКА!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Гучаць гарадоцкія маладыя галасы на родных мерапрыемствах. Іншы раз убачыце іх — хлопчыкаў і дзяўчатак — у адмысловых касцюмах у клетачку. Элегантна! А сёння, 26 ліпеня, на „Сяброўскай бяседзе" ў лесе ў Гарадку, у гарачыню, яны ўсе ў жоўценькіх маечках, на якіх красуецца назва калектыву: „Казка". Праўда, не ўсе тут яны — канікулы ж у разгары. Ды сабраліся ўсе хто мог прыбегчы ў Барык пад кіраўніцтвам дзвюх сваіх паняў — Марысі Абрамовіч і Касі Кокець.

— Я з каляжанкай даўно ўжо думалі, каб заснаваць такі калектыў у нашай школе, — расказвае пані Марыся. — Бо ў нашай школе ў Гарадку дзеці даўно не спявалі па-беларуску. Была такая патрэба! І мы таксама любім нашы песні, любім сустракацца. У снежні будзе ўжо два гады, як сустракаемся. І бачым, што не дарма! Дзеці расспяваліся, любяць гэтую справу, пасябравалі і паміж сабою — песня яднае! Ёсць у нас група з пачатковай школы і група з гімназіі. Рэпетыцыі ў іх праводзяцца асобна, бо і рэпертуар яны любяць розны. Разам яны выступаюць таксама. Рады ўсе! Ад самага пачатку нас падтрымлівала пані Вера Тарасэвіч, быўшы дырэктаркай. Цяпер пані дырэктар Эля Грэсь ганарыцца намі і можам разлічваць на яе падтрымку. Спадзяемся, што будзе так заўжды. Бо колькі радасці ад нашай „Казкі"! І не толькі для нас! Ездзім усюды, куды нас запрашаюць. У апошні час былі мы ў Новай Волі, на адкрыцці сацыятэрапеўтычнай святліцы і спявалі як госці. Усе дзеці гулялі, і нам было таксама прыемна...

Гурт „Казка" з гарадоцкай школы з паняй Марысяй Абрамовіч (першая злева) і паняй Касяй Кокець

Адкуль „Казка"? Дзеці самі выдумалі. У школе быў аб'яўлены конкурс на назву. Найбольш даспадобы была вось казка — казачны, незычайны, радасны свет, дзе перамагаюць дабрыня і краса!

ХАТКА ў ПЫХАВЫМ ЗАКУТКУ

А. Мілн
Пераклаў Віталь Воранаў

ВЫСТУП

Уступ пішацца дзеля таго, каб чытачы зь кімсьці пазнаёміліся, але ж Крыштусь Родзька і ягоныя сябры, зь якімі вы ўжо добра знаёмыя, цяпер часова хочуць з вамі разьвітацца. Атрымліваецца зусім наадварот. Калі мы спыталі ў Пыха, як будзе называцца Уступ наадварот, ён наўрад ці нешта зразумеў, бо спытаўся:

— Наадварот чаго?

Як бачыце, яго адказ нам ня надта дапамог, хоць мы, як заўсёды, на Пыха спадзяваліся. На шчасьце, прыляцела Сава, а яна мае галаву на плячах, і менавіта яна сказала:

— Шаноўныя, Уступ наадварот — гэта Выступ.

А паколькі Сава выдатна разьбіраецца ў складаных словах, я ўпэўнены, што менавіта так яно і ёсьць.

Выступ склаўся пасьля таго, як на мінулым тыдні Крыштусь Родзька сказаў мне:

— А можа, ты нечым закончыў бы тую прыгоду, якую ты ўзяўся мне распавядаць, пра Пыха і тое, што здарылася зь ім, калі...

Я хутка перавёў пытаньне на Крыштуся:

— Змагу, калі ты скажаш, колькі будзе дзевяць, памножанае на сто сем.

Мы потым усё дакладна палічылі і заняліся задачай пра кароў, якія вяртаюцца праз вароты з пашы на падворак і йдуць так павольна, што апынаюцца за агароджай з хуткасьцю па дзьве ў хвілінку, а ўсяго іх пасьвіцца трыста, дык стаіць пытаньне: колькі кароў застанецца на палетках, калі міне паўтары гадзіны? Лічыць іх надзвычай цікава, а калі мы дасыта налічымся, то скручваемся на ложках і засынаем... Толькі Пых яшчэ нейкі час сядзіць на крэсьле з боку Крыштусевай падушкі і думае Глыбокую Думку пра Нішто, пакуль яго вочы таксама не заплюшчваюцца. І тады мы ўсе разам ідзем на дыбачках у Чароўны Лес. Там нас чакаюць розныя прыгоды, яшчэ больш незвычайныя за тыя, пра якія я вам ужо распавядаў, але калі ўраньні мы прачынаемся, успаміны пра іх уцякаюць раней, чым мы здольныя іх злавіць. Як там пачыналася апошняя прыгода? „Аднойчы Пых ішоў сабе па Лесе, а пад агароджай сядзела сто сем кароў...". Ну, вось бачыце, зноў ад нас уцяклі ўспаміны пра яе. А яна, дарэчы, была найбольш цікавай. Ну, нічога, засталося яшчэ некалькі іншых, якім мы не дамо ўцячы, але на нейкі час перарвемся. Вядома ж, гэта будзе не сапраўднае Разьвітаньне, бо Чароўны Лес ёсьць і будзе заўсёды... і кожны, хто пасябраваў зь Мядзьведзікам Віня-Пыхам, знойдзе туды дарогу.

А.А.М.

Ніка шукае рэдакцыйных цукеркаў

Міра ЛУКША

Певень з Петухоўкі

Каля Царскага гасцінца
Небяспечна паявіцца:
Там разбойнік з грабянём
Усё цікуе ноччу й днём:
Напалохаць, закрычаць
Ды гадзіннік адабраць!
Бо нашто гадзіннік людзям!
Лепшы з Пецькі самы будзе!
Скукарэкаць восем-пяць!
Поўнач, поўдзень паказаць!
Можа, поўнач — ну дык не...
Што ж хадзіць тут вам у цьме?!
Квокча мужу Пецьку курка,
Шэрапёрая Барбурка:
— Не разбойнічай! Паспаў бы!
Людзям ім свой час аддаў бы!
У куратніку — ні дня!
Я без яек дый адна!
У куратнік раз-два шастай,
Мой грабежнік грабянясты!

Фота Ганны Кандрацюк

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ЗРАЗУМЕЦЬ, ЧЫЯ МЫШКА ЛІШНЯЯ...

Калі б не было вясны — не было б кахання, а калі б не было кахання — не было б вясны, ці не так? Толькі каханне бывае рознае. Бывае шчаслівае і ўзаемнае, а бывае — сумнае і непадзельнае. І каб зразумець апошняе — іншым разам не трэба ніякіх слоў.

На дзень нараджэння Антончыка прыйшло шмат сяброў і сябровак. Сярод іх — Васілінка і Кацярынка, якіх ён чакаў асабліва. І ўсё ж, кагосьці з іх — чакаў крыху болей... І так атрымалася, што і Васілінка, і Кацярынка ўручылі яму амаль аднолькавыя падарункі. Кожная падарыла падставачку пад тэлефон: па гарэзлівай, мілай, парцалянавай мышцы. Усцешаны Антончык аднолькава цёпла падзякаваў кожнай дзяўчыне і запрасіў да ўсіх гасцей — у пакой, дзе была музыка, смех, жарты, розыгрышы, частаванне.

І праляцеў той дзень нараджэння як імклівы травеньскі дзень, асыпаўся як белы квет з шапатлівых, узнёслых яблынь.

А наступным днём — не было ніякіх гасцей у доме Антончыка. Толькі... Васілінка і Кацярынка, не згаворваючыся, амаль у адзін час завіталі да яго на гарбатку. І зноў загучаў там смех, зноў юнак быў святочны і ўсцешаны. І за смехам зусім не заўважыў, як раптам зніклі іскрынкі з вачэй Васілінкі, як задрыжаў кубачак у беспрытульных дзявочых руках. Здаецца, не заўважыла гэтага і Кацярынка.

Як зусім не заўважала, што падараванае Васілінкаю мышанё сціпла стаіць у куточку на кніжнай паліцы. Затое даўно звярнула ўвагу на сваю падстаўку, якая трапна ўладкавалася на самым відным месцы: на пісьмовым стале, побач з камп'ютэрам. Вачаняткі гэтай мышкі, здавалася, яшчэ болей лучылі гарэзнасць, банцік сярод забаўных вушэй так і прасіў дакрануцца да яго, а два вострыя мілыя зубікі ператваралі мышыную ўсмешку ў чароўную непаўторнасць.

Ціха і проста развіталася Васілінка. Развіталася са сваёй сяброўкай. Развіталася з Антончыкам, які крыху нават здрыгануўся ад ейнага пагляду, што ўспыхнуў прыхаваным полымем. Развіталася са сваёй мышкаю, якая таксама ўсміхалася, — толькі самотна і адзінока. З мышкаю, якую не бачыла ўжо ніколі.

Толькі зрэдку, калі ўсё-такі здаралася выпадкова сустракацца з Антончыкам, — гэтак жа самотна і адзінока глядзелі на яго ейныя буйныя, вільготныя вочы...

Ваш Дзядзечка Сід
10 траўня 2008 г., Кобрын

Музыка з кайфам

„ULIS" — дваццацігадовы раман

Фестываль „Басовішча" ўжо за намі. Шмат уражанняў, многа музыкі і больш або менш цікавых выступаў. Сучаснае „Басовішча" зусім рознае ад першых, але нясе за сабой і смак гісторыі, і запах будучыні. Адным са смакаў мінулага, які добра сябе адчувае і сёння, з'яўляецца гурт характэрны ўжо самой назвай — аднайменнай з героем рамана Джэймса Джойса „Уліс". Таму на „ULIS" можам глядзець у розных планах.

У 1988 годзе пачынаецца гісторыя гурту „ULIS". І хаця гэта абазначала канец славутай у тыя часы „Бонды", то прынесла шмат новага. Падзеі пачаліся з выдання альбома „Чужаніца" і першых пяць гадоў усё круцілася паспяхова: канцэрты, выданні, вялікая папулярнасць, дзякуючы дасканалай музыцы, вакалісту Андрэю Патрэю ды тэкстам Фелікса Аксёнцава. Немагчыма аднак ісці ўвесь час уверх, таму ў палове 1990-х гадоў прыйшоў крызіс. Справіўся з ім Слава Корань, гітарыст гурту „ULIS", а пасля таксама і яго вакаліст. Гэта ён не захацеў спыніць прыгод гурту і стараўся трымаць яго пры жыцці.

Праекты, якія паяўляліся пазней, па якасці былі сапраўды рознымі. Сам Слава кажа, што поўнасцю задавальняе яго толькі апошні — альбом „Люстэрка", які і на маю думку прынёс шмат новага, сапраўды цікавага. Гледзячы на прапановы беларускіх музыкаў, „Люстэрка" на гэтым фоне паказвае, што можна рабіць нешта па-свойму. Але хаця на апошнім альбоме знойдзем новыя

песні і пару старых у новай аранжыроўцы, немагчыма забыць пра зусім старыя творы, напрыклад „Пляц Францыска" ці „Марнатраўны сын". Сёння мо і гучаць яны быццам з іншай эпохі, але колькі ў іх задум, колькі спеласці. Каб уявіць сабе тагачасную энергію, можаце пашукаць у інтэрнэце, асабліва на youtube.com славутую „Краіну ў кратах". Варта!

Хаця сёння „ULIS" зашмат не канцэртуе, бо і жыццё напраўляе музыкаў у розныя іншыя напрамкі, то жадаю вам займець магчымасць пачуць канцэрт гэтага гурту ўжывую, калі жорсткія гукі пераплятаюцца ў мяккай прасторы, каб у вашых галоўках з'явіўся яшчэ адзін беларускі гімн: „Радыё Свабода..."!

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

На ўроку фізікі

Настаўнік фізікі пытаецца:
— Ці прыклад дасць мне моладзь?
Ад цяпла ўсё пашыраецца,
А корчыцца ўсё ў холад?

Аліна найсмялейшая
Прыводзіць прыклад гэткі:
— Зімой дні карацейшыя,
Даўжэйшыя улетку.

У касцёле

Прыйсці ў касцёл сыночак змог
Са сваёй матуляй.
— Слухмяны будзь, жыве тут Бог,
Не думай тут пра гулі.

— Казала ў небе жыве Бог,
Я ў гэта цвёрда веру.
— Ды не рабі ты засцярог,
Тут мае свой інтэрас.

Польска-беларуская крыжаванка № 31

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 27:

Гара, Воля, возера, каты, мяч, на, аўтар. Но, вока, доза, лета, яры, мат, роля, чар.



Радавы дэпутат Матвяюк?

*Размова з доктарам **Яраславам Матвеюком**, саракагадовым беспартыйным дэпутатам ад парламенцкага клуба СЛД, які выводзіцца з беларускага асяроддзя, прадэканам Юрыдычнага факультэта Універсітэта ў Беластоку.*

„Ніва": — *Ці лёгка ў гэтым скліканні Сейма быць у апазіцыі?*

Яраслаў Матвяюк: — Быць у апазіцыі заўжды вялікая адказнасць, паколькі апазіцыя павінна быць незвычайна добра падрыхтаваная, каб паказваць слабыя бакі праектаў, накіроўваных прэзідыуму Сейма ўладнай кааліцыяй. У гэтым скліканні такіх урадавых праектаў усё яшчэ незашмат. Калі ўжо ёсць, дык часта яны малой якасці. Знакамітым прыкладам гэтаму быў медыйны закон, які ў перакананні спецыялістаў не вытрымаў бы працэдур перад Канстытуцыйным трыбуналам.

— ***Якая Ваша пазіцыя ў клубе? Мне здаецца, што яна ўсё мацнейшая. Хоць бы таму, што пачалі Вы паяўляцца сярод лідэраў СЛД на прэс-канферэнцыях трансляваных тэлебачаннем.***

— Я перш за ўсё гэтак званы мерытарычны дэпутат і не ангажуюся ў тыпова палітычныя мерапрыемствы, у сувязі з тым штораз часцей мяне запрашаюць на прэс-канферэнцыі. Кіраўніцтва клуба запрапанавала мне ўдзел у следчай камісіі па справах г. зв. аказвання націскаў на спецслужбы і іншыя органы. Я не даў згоды, паколькі ўдзел у камісіі патрабуе — як мне здаецца — вялікай палітычнай ангажаванасці. А я ўсё радавы сябра клуба.

— ***А хто з падляшскіх меншасных дэпутатаў у Сейме аказвае найбольшы ўплыў: Вы, ці дэпутат Яўген Чыквін?***

— Калі ласка, прашу мяне звольніць ад адказу на гэтае пытанне. Ацэніць грамадства ў найбліжэйшыя выбары, а, можа, будзе гэта відавочным раней. Магу сказаць столькі. У мяне пяць дэпутацкіх бюро ў рэгіёне, а з восені будзе яшчэ адно. Я і мае асістэнты сустракаемся там з людзьмі. Інфармацыю, якую такім чынам атрымліваю, пераношу на інтэрпеляцыі ў Сейме. Калі б я быў лянівы, гэтага б не рабіў.

— ***Прынамсі сярод дэпутатаў ад Падляшскага ваяводства, да таго з усіх парламенцкіх груповак, дагэтуль Вы падалі найбольшую колькасць інтэрпеляцый. Я налічыў іх больш за сто. У той час калі, вось, напрыклад, віцэ-маршалак Сейма ад падляшскага ПіС Кшыштаф Путра — да пяцідзесяці, успомнены мною Ваш клубны калега Яўген Чыквін — дзве, а хоць бы падляшскі дэпутат ад Грамадзянскай платформы Яцак Жалек — ніводнае. Чым гэта тлумачыць?***

— Рашаючыся кандыдаваць у Сейм я гэтае прадугледзіў і гэты сцэнарый рэалізую, што буду дэпутатам якраз мерытарычным і буду вырашаць рэальныя праблемы, а не выдуманыя, тыпова палітычныя, што буду даступным для людзей.

— ***Тады вось пяройдзем да мерытарычных пытанняў. На адной з успомненых прэс-канферэнцый, трансляваных у прамым тэлеэфіры, гаварылі Вы аб зменах закону датычнага пракуратуры. Нашто гэтыя змены?***

— Таму, што я меў прыемнасць весці працы над гэтым праектам закону і прадстаўляць праект ад імя клуба перад Сеймам, мяне запрашалі на рознага тыпу прэс-канферэнцыі. Вопыт апошніх больш чым дзесяці гадоў паказвае, што калі міністр юстыцыі аўтаматычна з'яўляецца генеральным пракурорам, значыць, палітык, член такой палітычнай установы, якой з'яўляецца Рада Міністраў, шэфствуе пракуратуры, дык гэта нясе за сабой сур'ёзныя пагрозы для спраўнай дзейнасці пракуратуры. Ад больш чым дзесяці гадоў даходзяць сігналы аб паяўляючыхся націсках на пракуратуру. Трэба ўзмоцніць яе незалежнасць. Праекты як ГП, так і лявіцы ідуць у гэтым напрамку, толькі што праект левых ідзе далей. Пры нагодзе раздзялення функцый генеральнага пракурора і міністра юстыцыі прапануюць яны зрабіць цэлую рэформу структур пракуратуры. Напрыклад, ліквідуючы Краёвую пракуратуру для таго, каб як найбольш пракурораў перастала выконваць назіральныя функцыі і сталі працаваць на першай лініі фронту змагання са злачынствамі, напрыклад, весці падрыхтовачныя працэсы.

— ***Вы з'яўляецеся членам м.інш. надзвычайнай падкамісіі па абмеркаванню дэпутацкага праекта закону аб змене закону аб Агенцтве ўнутранай бяспекі і Агенцтве разведкі. Для чаго гэтая камісія і гэтыя змены?***

— Я ў гэтай камісіі, паколькі ў мяне ёсць пасведчанне аб доступе да чыста сакрэтных інфармацый. Змены, а асабліва іншы закон аб аператыўна-апазнавальных дзеяннях, маюць на мэце ўдакладніць юрыдычную пазіцыю спецыяльных службаў у краіне з аднаго боку, з другога — забяспечыць гэтыя органы ад палітычных уплываў, да таго ўдасканаліць функцыянаванне гэтых органаў з адначасовымі гарантыямі шанавання правоў і свабод чалавека ды грамадзяніна.

— ***Вы сустаршынуеце таксама надзвычайнай камісіі па абмеркаванню законаў аб змене Канстытуцыі. Якіх змен датычыць справа?***

— Мяне, канстытуцыяналіста, працаўніка Кафедры канстытуцыйнай юрыстыкі Юрыдычнага факультэта універсітэта ў Беластоку ад шаснаццаці гадоў, заўважылі і аднадумна даручылі гэтую функцыю. Згаданая камісія займаецца двума праектамі змен Канстытуцыі. Першы будзе датычыць абмежавання пасіўнага выбарчага права. Карацей кажучы, справа ў недапушчэнні да кандыдавання ў Сейм і Сенат, а таксама ў іншых выбарах асоб, якія былі асуджанымі, злачынцаў. Камісія спрабуе адказаць на пытанне, ці абмежаваць гэтае права ўсім злачынцам, значыць, таксама такім, якія ўчынілі парушэнні, злачынствы „лёгкага віду". Здаецца, не? Бо відавочным ёсць, што абавязкова трэба абмежаваць выбарныя правы за злачынствы такія як забойства, згвалтаванне, здрада краіне ці шпіёнства. Другі праект датычыць абмежавання дэпутацкага імунітэту і ён, як мне здаецца, выклікае найбольшыя сумненні. Паяўляецца вось пытанне, ці дэпутацкі імунітэт увогуле ліквідаваць, ці зрабіць толькі абмяжоўваючую яго карэктуру. Першыя плады прац камісіі павінны быць ужо вядомыя восенню.

— ***Апрача ўдзелу ў працах шасці сеймавых камісій і падкамісій Вы з'яўляецеся членам трох міжнародных, двухбаковых парламенцкіх груп: Польшча — Боснія і Герцагавіна, Польшча — Украіна і Польшча — Расія. У гэтай апошняй Вы віцэ-старшыня. У сувязі з гэтай функцыяй і ўдзелам у гэтай апошняй групе скажыце, якія найважнейшыя пытанні для абмеркавання ў адносінах Польшчы і Расійскай Федэрацыі?***

— Ад шмат гадоў стасункі Польшчы з Расіяй благія і патрабуюць паляпшэння. Найважнейшай праблемай для вырашэння з'яўляецца недахоп узаемнага даверу і празмерны ўдзел ва ўзаемных адносінах гістарычных элементаў. Я рады, што ад пару месяцаў даходзяць сігналы аб нейкіх зменах ва ўзаемнай палітыцы. Паколькі прыкмячаю, што пазіцыя Расійскай Федэрацыі на міжнароднай арэне пачынае ўзрастаць, было б адпаведным, каб з карысцю для абедзвюх краін і абодвух грамадстваў гэтыя адносіны былі нармальныя. Гаворка тут перш за ўсё аб ажыўленні эканамічнага абмену...

— ***... Ды з якой пазіцыі Варшава павінна размаўляць з Масквой?***

— Перш за ўсё з пазіцыі шанавання ўзаемных інтарэсаў і мерытарычных пазіцый. Ані наша пазіцыя ўзвышанасці, ані ўступчывасці да нічога добрага не вядуць. Як найменш палітыкі, а як найбольш талковай (дзелавой) дыскусіі.

— ***А як размаўляць з Мінскам?***

— З кожнай краінай так трэба размаўляць, памятаючы аб інтарэсах сваёй дзяржавы, але шануючы, наколькі гэта магчыма, інтарэсы іншай краіны. Такія павінны быць правілы дыпламатыі.

— ***Як Вы ацэньваеце факт, што Еўрасаюз указаў Польшчы рэнегацыяцыі дамовы аб малым памежным руху з Украінай і як Вы ўспрымаеце негацыяцыі аб падобнай дамове з Беларуссю?***

— Некалькі раз я інтэрвеніяваў у гэтых справах і лічу іх за адну з прыярытэтных асабліва для Беласточчыны і шырэй для Падляшскага ваяводства. Для нашага рэгіёна да ўвядзення Шэнгенскай дамовы супрацоўніцтва з Беларуссю і іншымі ўсходнімі суседзямі было рухавіком падляшскай гаспадаркі. Я з прыкрасцю ўспрыняў факт неабходнасці рэнегацыяцыі дамовы аб малым памежным руху з Украінай. Я прытым задумаўся, наколькі быў гэта вынік няведання, ці нейкіх няўмеласцей дамаўляючыхся бакоў, і наколькі сапраўды гэта неабходна.

— ***Ці ў адносінах да Беларусі павінны быць абмежаваны, ці нават адменены, як хочуць некаторыя польскія палітыкі, санкцыі якія прымяняюць Польшча і шырэй — Захад?***

— Я супраць любых санкцый. На міжнароднай арэне праблемы павінны вырашацца ў выніку дыялогу, дыскусіі. Вынікі санкцый благія для грамадстваў, а неабавязкова для самой улады, якую яны маюць кранаць.

— ***Вы працуеце ў парламенцкіх групах Польшча — Расія і Польшча — Украіна, а чаму Вас няма ў парламенцкай групе па справах Беларусі, якой шэфствуе старшыня падляшскай ГП Роберт Тышкевіч?***

— Я не атрымаў такой прапановы. Падаў я, аднак, заяву аб далучэнні да Парламенцкай групы Польшча — Беларусь. Калі яна ўзнікне, буду яе членам. Пакуль што, аднак, яна яшчэ не ўзнікла.

— ***Вярнуся я яшчэ да свайго тэзісу аб тым, што Ваша пазіцыя ў клубе і ў Сейме відна ўзрастае. Як Вы бачыце сваю далейшую палітычную кар'еру?***

— Не люблю назвы „палітычная кар'ера". Мне хацелася б, як я ўжо ўспамінаў, засяродзіцца на мерытарычнай дзейнасці. Для мяне прыярытэтам з'яўляецца навуковае развіццё. Калі, аднак, паявяцца прапановы, ушаноўваючыя мае мерытарычныя веды і факт беспартыйнасці, я іх, мабыць, вазьму пад сур'ёзную развагу. Не за ўсю, аднак, цану.

— ***Дзякуем Вам за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Фота архіў Нівы

У царкве? Там усё ёсць!

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Зіна і Сашка Несцерукі

Зінка і Сашка

У царкву малую Зінку вадзіла мама, якая, на жаль, хутка памерла. Зінцы было тады сем гадоў. Асталася яна і чацвёра старэйшых дзяцей. Хацелі параскідваць іх усіх па цётках, але неяк вярталіся яны ўсе ў сваё Новае Ляўкова. Аднак Зінка засталася на чатырнаццаць гадоў у Ахрымах. Не так страшна, бо Ахрымы ад Ляўкова раздзяляла толькі малая багна.

— Помню, калі немцы ішлі, то я пасвіла каня на багне. Прыйшоў дзядзька змяніць мяне, бо жахліва стралялі. Усе, якіх на багне забралі ў Ахрымы, выратаваліся ад расстрэлу дзякуючы солтысу, які ведаў пару слоў па-нямецку.

Ваенных успамінаў у Зінкі больш. Помніла, дзе была нямецкая кватэра, помніла, як танкі ішлі ад лесу, помніла, як бацюшка за саветаў мусіў ездзіць рабіць у тартак.

— Оооо! За немцаў было супер. Я рабіў у Ваўкавыску, за брата, але і перагружаў тавары. Грошай было многа.

Так успамінае час вайны дзядзька Сашка. Не было кепска, хаця сам прызнаў, што напрыканцы вайны ледзь не пайшоў з жыцця. Перажыў, лёс такі.

Разам і асобна

Хаця абое з адной вёскі, то пазнаёміліся даволі позна. Лёс хацеў, каб знаёмства хутка пераўтварылася ў супольнае жыццё, назаўсёды.

— Памятаю, як заехалі ў Нараўку запісвацца, — успамінае Сашка, — як пабачыў, што яна за мяне на два гады старэйшая, то...

— Таму і казаў усё жыццё на мяне старая, — даказвае жартоўна Зінка, — а цяпер што, малады занямог і старой трэба ім займацца!

Дзядзька Сашка толькі ўсміхнуўся, але ў гэтай усмешцы было ўсё: і радасць, і сум, і жаль. Ён зараз самастойна жыць не мог бы, хвароба пазнавочніка абмежавала магчымасці руху. Ходзіць памалу з палкай па хаце, то перад хатай.

— А ўсё жыццё круціўся як вуж, — кажа Зінка. — Ведаеце, яго ніколі не было ў хаце!

Праўда, Сашка працаваў на заправачнай станцыі, на хімічным заводзе ў Гайнаўцы, быў дарожным майстрам, нават намеснікам кіраўніка. Для гаспадаркі не было ў яго часу.

— На гаспадарцы рабіла я, бацька яшчэ дапамагаў, але было вельмі цяжка. Думаеце, мяне пазнавочнік не балеў? Быў перыяд, што і я не магла нічога рабіць, можна было мне падымаць максімальна да пяці кілаграмаў. Што ў такіх умовах напрацуеш на гаспадарцы? А яго не было...

Зінчына жыццё не было лёгкім — гаспадарка, дзеці. Час ад часу адрываліся ад работы. То ездзілі наведаць сям'ю ў Варшаву, то на адпачынак у Райград. Варшаву Зінка ўпершыню бачыла ў 1947, яшчэ разбураную ў выніку вайны, а раней толькі чула як на вёсцы казалі, што ідуць на Варшаву і страляюць там.

Нідзе аднак не падабалася Зінцы так, як у Ляўкове. Аднаго толькі жаль, што не жыве бліжэй царквы, толькі на калёніі. Калі мы гутарылі пра жыццё, Сашку і Зінку наведалі сваякі.

— Цёцю, а ў царкве сёння былі?

— Была. Ведаеце, калі я захварэла і ўжо на ровары сама не змагла ездзіць, то дзеці, а пазней і ўнукі, прыязджалі ў нядзельку з Беластока ці Гайнаўкі, бо нас трэба было завезці ў царкву. Я зараз час ад часу на ровары змагу пад'ехаць, але Сашка ўжо не. Гэтага зараз яму найбольш жаль.

Супольная дарога ў царкву

Шлюб Сашкі і Зінкі адбыўся ў 1949 годзе. Хор ім прыгожа спяваў, бо пасля вайны быў самы залаты перыяд у яго дзейнасці.

— Я з маленства марыла, каб спяваць у хоры, — успамінае Зіна. — Можа я і не мела такога голасу, але калі дзяўчынкай стаяла ў царкве, то цэлы час пад носам спявала. Мая сястра, помню, не мела такой адвагі, але я марыла. Калі ўпершыню я, засаромленая, ішла на спеўку, па дарозе наш рэгент узяў мяне за руку і пацягнуў за сабой.

Сашка кажа, што ён першы за Зінку спяваў у хоры, бо і яго старэйшы брат спяваў. Яна яго не помніць, затое абое ўспамінаюць сваіх дырыжораў, успамінаюць той цудоўны перыяд, калі рытм жыцця вызначаў царкоўны хор. У розны час і за розных бацюшкоў праца была па-рознаму напружаная, але добра помняць той перыяд, калі ляўкоўскі хор запрашалі на Крыначку, калі спявалі гасцінна ў Дубінах, калі ў многіх цэрквах не было роўных ім хароў.

— Яшчэ засталіся нат старыя запевы з тамтых часоў, — кажа Зінка. — Яны былі характэрныя і сапраўды прыгожыя, таму як зышоў ад нас Новік, пасля і Грыц, то самыя прадаўжалі тую традыцыю.

Што гэта за час быў! Кожны год хор сустракаўся ў кагосьці на супольнае святкаванне. Таксама, калі пасля шлюбаў даставалі „барыш", то трэба было разам яго з'есці і выпіць. Як у большасці хароў.

— Гэта было адчуванне такой супольнасці, як у сям'і, — падказвае Зіна. — Але той перыяд не быў доўгі, людзі па-рознаму пачалі ставіцца да спеваў, некаторым больш даспадобы былі б грошы, чым той „барыш", а і не заўсёды можна было прысесці на плябаніі.

Хаця настроі мяняліся, былі справы, забыць якіх немагчыма. Гэта перш за ўсё людскія галасы. Колькі было басоў, колькі тэнараў, а дзяўчат колькі спявала.

— Нас пад дваццаць было напэўна, можа і больш, але такіх сур'ёзных, якія адказна спявалі. Такія цудоўныя тэнары ў нас былі. Некаторыя ў вёсцы казалі, што ідуць у царкву, каб хоць майго Сашку паслухаць. Ён сапраўды меў талент.

Хаця ён за працай быў заўсёды далёка, то спалучала іх царква. Супольна спявалі ў хоры, супольна з хорам святкавалі, здаецца, супольна адчувалі, хаця вялі жыццё па-свойму.

— Ой, усяляк бывала. Ездзілі на роварах на літургію. Ён заўсёды хутчэй, то паспяваў яшчэ з калегам кілішак выпіць „на добры голас". Увогуле, то калегі, рэчка і рыбалка часам былі важнейшымі за ўсё! Але, нягледзячы на ўсё, спяваў, увесь час.

Калісьці „на Патра" прыехаў у Ляўкова чалавек з Гарадка. Паслухаў хор і сказаў, што забярэ Сашку на курсы і стане ён дырыжорам. Мае вуха.

— Забраў яго, паехалі ў той Гарадок. Можа і стаў бы гэтым дырыжорам, каб не тое, што на месцы прыямней было выпіць ці пайсці на рыбалку. Мой Сашка такі быў, дасціпны, шпаркі, — кажа Зінка, гладзячы мужа па галаве.

Сядзім дзве. Дзядзька Сашка выйшаў з пакоя. Цішыня.

— Не знаю як гэтае жыццё прайшло. Не адзін раз заломвала рукі, з тым маім Сашкам... Так мела быць, мусіць лёс такі.

Разам да канца жыцця

Зараз працы зашмат няма, ужо восемдзесят на плячах. Сашка рыхтуецца ў Гайнаўку ў шпіталь лячыць пазнавочнік. Зінка чакае візіту ў акуліста.

— Часу зараз у мяне многа, таму і шмат чытаю, але вочы ўжо не тыя.

На паліцы ляжаць святыя кніжкі, жыціі святых, цэлая падборка „Праваслаўнага агляду". Ляжыць там таксама добра вядомы мне багагласнік. Да Сашкі і Зіны Несцерукоў я ўпершыню трапіла на Вялікдзень, бо яны — дзяды маёй сяброўкі. Селі мы за стол, выпілі, паелі. Дачка гаспадароў узяла той жа багагласнік, кажучы:

— Ну, а зараз пара, мамо, традыцыйна праспяваць „Хрыстос воскрэсе із мертвых".

І пачалі спяваць. Хаця дзядзька Сашка ўжо не ў змозе, то я глядзела ў вочы нашых гаспадароў і толькі тады здагадалася, што мы знаёмыя з хору, бо і мне прыйшлося пару гадоў спяваць у Ляўкове.

— Я зразу цябе пазнала, — сказала мне гаспадыня. Мне аж сорамна стала.

— Але я і добра ведала тваіх дзядоў! — дадала Зіна.

То ж з адной парафіі. Мая бабця „моляшча" вельмі не была, углядалася толькі ў сваю гаспадарку.

— А я без царквы жыць не магу, — працягвае Зіна. — Зараз, калі я няўпэўненая, ці дабяруся ў нядзельку ў царкву, то сяду тут пры стале і са сваіх кніжачак адпраўлю вячэрню ды ютранню, — сардэчна ўсміхаючыся распавядае гаспадыня. — Я як я, але як цяпер Сашку гэтага бракуе. Былі моманты розныя. Ведаеш, тады то не любілі, што некаторыя ходзяць у царкву, таму і Аляксандр з Лешукоў не заўсёды быў. Дырэктару лепш было ў царкве не паяўляцца. Таму мой Сашка мусіў быць заўсёды, каб тэнараў хапала.

Зіна пра царкву расказвае з такой пасіяй, што цяжка адарвацца. Час ад часу на момант адлятае ва ўспаміны. Пытаю, ці зараз спявае на пахаваннях.

— Як хтось мяне завязе, то так. Гэта ж мой абавязак. О, тут сусед нам памёр пару дзён таму, як я магла не пайсці. Мушу.

Так усё жыццё „мусілі" Зінка з Сашкай хадзіць у царкву, бо без яе, бяз спеваў гэта не жыццё.

— З'ездзілі мы калісь на экскурсію для пенсіянераў, — успамінае Зіна. — У Супрасль паехалі, дзесьці там пад мяжу, але знаеш, мяне да турызму не цягне, мяне цягне да святога.

Дзмітры ШАТЫЛОВІЧ

Падарожжа на Падляшша

Цягнік ляціць ужо знаёмай
мне мясцінай,
Дзе я не раз па слізкіх рэйках
праязджаў,
Штогод змяняе від свой родная краіна,
А за акном яе аплаквае імжа.

Там, дзе калісь густы быў лес,
амаль там гола,
Ядлоўцы толькі рэдкія глядзяць на нас,
Старыя хаты замільгаюць недзе ў сёлах,
Там з нейкіх хат астаўся
толькі сам каркас.

А там, дзе рос калісь ячмень,
авёс ці жыта,
Цяпер стаіць пасаджаны зялёны лес,
Вакзалаў бачу многа ўжо зусім
закрытых,
Бо тут не едзе ні адзін цягнік-экспрэс.

І на вакзалах вельмі мала пасажыраў,
Амаль няма сярод іх хлопцаў маладых.
Бабулька ўходзіць раптам
з сынам-павадырам,
Які вязе яе засмучаны кудысь.

Калісь дзяўчыны часта ездзілі гурбою,
Спявалі песні аж дрыжэў увесь вагон,
Іх смех гудзеў, як жартавалі між сабою,
І чуўся ён на ўсіх вакзалах з іх акон.

Цяпер галоснай тут не чуецца размовы,
Стукочуць гучна толькі колы цягніка.
І не пачуў я ўжо ў вагонах роднай мовы,
На беспарадкі тут ніхто не наракаў.

А мой вакзал калісь прыемны і вясёлы,
Сустрэў мяне цяпер амаль зусім пусты,
Дзе кветнікі прыгожыя раслі наўкола,
Цяпер асот стаіць высокі і густы.

Дзённік Мар'яна Пецюкевіча

Сяргей ЧЫГРЫН

У Вільні Таварыства беларускай культуры ў Літве выпусціла „Мой дзёньнік" Мар'яна Пецюкевіча — выдатнага беларускага вучонага-этнографа, грамадскага дзеяча былой Заходняй Беларусі, рэдактара часопіса „Шлях Моладзі". Дзённік прысвечаны падарожжу ў Рым. Кніжка надрукавана накладам усяго 100 асобнікаў.

Усе кнігі Мар'яна Пецюкевіча, у тым ліку і „Мой дзёньнік", прачытаў я на адным дыханні і з вялікай асалодай. І буду чакаць новых выданняў з яго літаратурна-даследчай спадчыны. А спадчына Мар'яна Пецюкевіча вяртаецца да чытачоў, дзякуючы яго дачцэ Марылі Пецюкевіч.

У прадмове да выдання Марыля Пецюкевіч піша, што рукапіс дзённіка перадала ёй маці пасля смерці бацькі. „Праз шмат гадоў баялася ў яго зазірнуць, бо ўсё яшчэ быў сьвежы боль ад страты так блізкага мне чалавека... Нарэшце перамагла сябе і пачала чытаць гэты бацькаў Помнік, які ўжо з першых старонак паказаўся мне цікавым і маючым вялікую вартасьць...".

Сапраўды, „Мой дзёньнік" варты ўвагі, чытання, а таксама таго, каб пра яго пісалі газеты і часопісы. Той, хто прачытае „Мой дзёньнік" Мар'яна Пецюкевіча, у Рым можа ўжо не ездзіць. Асабліва гэта датычыць беларусаў. Але ж куды цяпер беларусы ездзяць?.. Тым не менш, шчыра скажу, у Рым можна не спяшацца — чытайце Пецюкевіча. Тут вы знойдзеце разважанні і апісанні пра базіліку святога Паўла, базіліку святога Пятра, замак святога Анёла, пра пляц святога Пятра, пра Монтэ-Касіна і г.д. Дарэчы, бітва пад Монтэ-Касіна — адна з самых трагічных баталій Другой сусветнай вайны, у якой прымалі ўдзел тысячы беларусаў. Наведаў Монтэ-Касіна Мар'ян Пецюкевіч разам з беларусам з Рыма Кастусём Маскалікам, які быў жаўнерам у арміі Андэрса і прымаў удзел у той бітве. Кастусь Маскалік аказаўся добрым праваднікам. Ён там ведаў усё. Мар'ян Пецюкевіч піша: „Прайшоўшы праз браму, якая вяла на магільнік, тут жа перад дзевяццю шэрэнгамі магіл з крыжамі, на пляцы выкладзеным плітамі, знаходзіцца магіла генерала Уладыслава Андэрса. На мармуровай пліце сціплы напіс. Генерал Андэрс памёр у Англіі, але на ягонае перадсмертнае жаданне, астанкі перавезены ў Montecassino, дзе спачываюць ягоныя жаўнеры. Перад гэтай магілай мы спыніліся. Айцец Кастусь па ўсходняму абраду адправіў паніхіду за сваіх сяброў па зброі і за свайго камандзіра Уладыслава Андэрса. Пасля паніхіды, мы прайшлі ад пачатку да канца ўсе рады магіл жаўнераў, падафіцэраў і афіцэраў. Тут жа пахаваны і арцыбіскуп Юзаф Гаўліна, біскуп Войска Польскага. Усіх магіл тут налічваецца 1052. Сярод загінуўшых у баях з азвярэлым фашызмам знаходзяцца і беларусы, і нават рускія, а па веравызнанні каталікі, праваслаўныя, стараверы з Браслаўшчыны, магамэтане і майсеевага веравызнання. Ляжаць там і мае суседзі — землякі з Браслаўшчыны і з іншых паветаў Беларусі. Айцец Кастусь кажа, што на гэтым ваенным магільніку спачывае больш двухсот беларусаў".

Калі я чытаў гэтыя радкі, успамінаў Мар'яна Пецюкевіча, прыгадалася мне кніга „Беларусы ў бітве за Монтэ-Касіна", што выйшла з друку пазалетась у Мінску, укладальнікам якой быў Юры Грыбоўскі. У гэтай кнізе, між іншым, надрукаваны спіс беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, якія палеглі падчас бітвы за Монтэ-Касіна і там пахаваныя. Сярод загінуўшых ёсць у гэтым спісе і беларусы з Беласточчыны: Мікалай Бурса (1908-1944), праваслаўны, стралец, Вінцэнт Яроцкі (1910-1944), праваслаўны, стралец, Караль Семянюк (1907-1944), праваслаўны, кананер і іншыя. Як піша спадар Пецюкевіч, пасля экскурсіі ў Монтэ-Касіна, яго дачка Марылька запрасіла на абед і пачаставала капустай з баранінай па-беларуску, дзяронікамі (блінамі з таркаванай бульбы) па-цяцерску са смятанай. Дзякуючы за абед, Кастусь Маскалік сказаў: „Ня еў я беларускай стравы ад 1940 году і хіба ўжо ня прыйдзецца есьці аж да сьмерці".

7 студзеня 1972 года Мар'ян Пецюкевіч упершыню прыехаў да дачкі Марылі ў Рым і кожны дзень рабіў у сваім календары кароткія зацемкі. Рымскі дзённік аўтар пачаў 7 студзеня, а закончыў 25 лютага 1972 года.

Найперш, чытаючы „Мой дзёньнік", адчуваеш і гэта пацвярджае дачка ва ўступным слове, што Мар'ян Пецюкевіч меў фенаменальную памяць. Яго рымскія зацемкі — гэта разважанні пра Рым, Італію, пра творы сусветнага мастацтва, гісторыю, рэлігію, пра Беларусь і беларускую эміграцыю. Вось пачатак дзённікавых запісаў — аўтар едзе ў Рым. Ён праязджае гарады Удзінэ, Трэвізо, Венецыю, Падую, Ферару, Фларэнцыю. „Праязджаючы праз Падую, я перажываў дзіўнае і непаўторнае пачуццё. Тут жа ў пачатку XVI стагоддзя ўзбагачаўся вышэйшымі ведамі наш несмяротны, вялікі гуманіст і гарачы патрыёт беларускага народа Францішак Скарына, сын са слаўнага горада Полацка", — піша Мар'ян Пецюкевіч.

У сваіх успамінах аўтар добра згадвае і Пятра Татарыновіча — беларускага рэлігійнага дзеяча ў былой Заходняй Беларусі. Ён быў заснавальнікам Беларускай секцыі Ватыканскага радыё ў 1950 годзе, выдаваў часопіс „Зніч". З ім таксама некалькі разоў сустракаўся ў Рыме Мар'ян Пецюкевіч...

Пра дзённік аўтара можна разважаць доўга, з нечым з ім пагаджацца, спрачацца. Такое выданне — засведчаны факт нашай гісторыі, нашай Бацькаўшчыны. У „Пасьляслоўі" да кнігі, якое напісала Марыля Пецюкевіч, хораша сказана пра яе дачку і ўнучку Мар'яна — Анжаліку. „Сёння мая дачка сцвярджае, — піша Марыля Пецюкевіч, — што ідэалы, якімі жыў яе дзядуля, жывуць і актуальныя, што барацьба за незалежнасць Беларусі, яе гонар і добрае імя сярод іншых народаў сусвету, барацьба за яе культуру і мову павінна трываць надалей і ўзмацняцца. З думкай аб дзядулі Анжаліка здала дадатковы экзамен па этнаграфіі, хаця вучыцца на факультэце палітычных навук. На экзамене інфармавала прафесара аб навуковых працах і даследаваннях свайго дзядулі этнографа, які самаахвярна даследаваў усходнія раёны Польшчы, што засяляюць беларусы. Гэта яшчэ адзін значны ўклад майго бацькі ў культурную скарбонку маёй Бацькаўшчыны".

„Мой дзёньнік. Пра падарожжа ў Рым", Вільня 2007.

http://z-roga.belarushosting.org

Іншым разам, блукаючы па неабсяжных прасторах „сусветнага павуціння" і нават па вельмі абмежаванай тэрыторыі Байнэта можна знайсці сайт, які напачатку не прыцягвае аніякай увагі. Але калі дасі сабе клопат паглядзець на яго больш пільна, то пачынаеш здзіўляцца, чаму не ведаў пра гэты інтэрнэт-рэсурс раней.

Усё вышэйзгаданае можна без перабольшання аднесці да сайта, які носіць крыху незвычайную назву — „З рога ўсяго многа". Месціцца ён па адрасе http://z-roga.belarushosting.org і выглядае больш чым сціпла. На ім практычна няма аніякіх аздабленняў. Ён падае выключна тэкставую альбо гукавую інфармацыю. І вось як тлумачыць такую справу аўтар гэтага „Рога". „Начынне гэтага сайта з'яўляецца толькі беларускамоўным. Гэта тлумачыцца вялікім жаданнем аўтара сайта адраджаць, папулярызаваць і распаўсюджваць беларускую культуру, як на Беларусі, так і за яе межамі. На гэтых старонках вы не ўбачыце ніякіх малюнкаў і розных там наваротаў, толькі інфармацыю і спасылкі на беларускі кантэнт, прычына гэтаму — недахоп часу і маіх навыкаў у сайтабудаванні. Спадзяюся, з часам усё выправіцца, — піша ён і дадае. — Цягам часу ў мяне назбіралася шмат усяго рознага і я вырашыў распаўсюдзіць, падзяліцца гэтым з дапамогай сеціва. У асноўным змест сайта прыдатны для выкарыстання ў школах, іншых навучальных установах і гэта не выпадкова, бо дзеці — наша будучыня. Спадзяюся, работнікі школ што-небудзь для сябе тут знойдуць і мая праца будзе не дарэмная".

З гэтага расповеду становіцца зразумела, што сайт — свайго роду дапаможнік у выхаванні і навучанні дзяцей. Адзінае не зусім зразумела, чаму такую добрую справу трэба рабіць, хаваючы сваё імя. На сайце мы не знойдзем аніякай інфармацыі пра тое, хто ж гэта такі дабразычлівец.

Кожная рубрыка „Рога" напоўнена карыснай інфармацыяй — ад сцэнарыяў школьных мерапрыемстваў да перакладзеных на беларускую мову праваслаўных богаслужэнняў. Калі цікавы карыстальнік, асабліва з ліку настаўнікаў ці выхавацеляў, зазірне на старонку з расповедам пра школьныя мерапрыемствы, то, мяркую, яго прыемна ўразіць падрабязная інфармацыя аб тым, як правесці школьныя імпрэзы, прымеркаваныя, напрыклад, першаму званку, Калядам, юбілеям знакамітых людзей і іншае.

Некалькі старонак сайта — музыкальныя. Тут у розных фарматах змешчаныя фальклорныя, дзіцячыя, аўтарскія песні. Цікава, што найбольшая колькасць песень месціцца ў падрубрыцы „Аўтарскія". Што да „Дзіцячых", то іх чамусьці не надта многа.

Апантанасць аўтара справай беларускамоўнага адраджэння найбольш яскрава праяўляецца на старонцы, якая называецца „Пагоня за мову". Акрамя розных заканадаўчых і нарматыўных актаў, якія цягам апошніх двух дзесяцігоддзяў былі прыняты беларускімі ўладамі, тут месцяцца розныя публіцыстычныя артыкулы на тэму стану беларускай мовы, яе месца ў сучасным грамадстве.

Не засталася ў баку і такая важная справа, як выкарыстанне ў праваслаўных богаслужэннях беларускага слова. На старонцы „Рэлігія" месцяцца розныя тэксты богаслужэнняў, перакладзеныя з блаславення мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Глеб для „Барселоны"

Найбольш гучнай трансфернай навіной беларускага футбола апошняга месяца стаў пераход Аляксандра Глеба з лонданскага „Арсенала" ў „Барселону". Пераходу капітана нацыянальнай дружыны Беларусі ў тытулаваны клуб сталіцы Каталоніі папярэднічала маса самых разнастайных чутак і варыянтаў. Такая ўжо прырода сучасных медый — пісаць не тое, што пра кожны крок вядомага футбаліста, а пра кожны яго ўздых, прытым выдумляць і дадаваць ад сябе ўсё новыя і новыя „сенсацыі". Аляксандр Глеб на сёння найбольш „раскручаны" беларускі футбаліст у свеце, хоць для роднай дружыны зрабіў пакуль досыць мала. Толькі новы сезон пакажа, ці правільным стаў яго новы выбар, ці паспешлівым і неабачлівым. Пару год таму зорка ўкраінскага футбола Андрэй Шаўчэнка пакінуў „свой" „Мілан" і падаўся ў лонданскі „Чэлсі" за яшчэ больш доўгім рублём, а дакладней — за фунтам стэрлінгам. Да такога кроку суперфорварда падштурхнула ягоная жонка — амерыканка, якой не падабалася Італія і якой хацелася ў англамоўную краіну. У выніку Шаўчэнка на туманным Альбіёне пераўтварыўся ў сярэднестатыстычнага гульца.

Асабіста я досыць песімістычна гляджу на бліжэйшыя барселонскія перспектывы Аляксандра Глеба, які, дарэчы, у міжсезонне аформіў свой шлюб з беларускай спявачкай Анастасіяй Касянковай з поп-гурту „Топлес". „Беларускаму Бекхему" будзе надзвычай цяжка замацавацца ў аснове іспанскага гранда. Па-першае, на яго пазіцыю прэтэндуюць больш аўтарытэтныя Андрэс Іньеста і Хаві (абодва нядаўнія чэмпіёны Еўропы). Па-другое, гульнёвая філасофія англійскага і іспанскага чэмпіянату досыць розныя.

Больш значнай падзеяй для айчыннага футбола на мінулым тыдні стаў выхад барысаўскага БАТЭ ў наступны раунд Лігі чэмпіёнаў. Можна смела канстатаваць, што барысаўцы ўжо навучыліся адольваць слабейшыя за сябе і роўныя па класе клубы. Абодва паядынкі чэмпіёна краіны з ісландскім „Валюрам" завяршыліся перамогай беларусаў. Выйграўшы дома з лікам 2:0, БАТЭ стварыў запас, а ў гасцях канчаткова зняў усе пытанні ўжо на першай хвіліне, калі Ігар Стасевіч забіў гол, які так і застаўся адзіным у сустрэчы. У чарговым (слова напісалася нібы само па сабе) раундзе барысаўцы сустрэнуцца з бельгійскім „Андэрлехтам", клубам са слаўнай гісторыяй і сціплым сучасным.

Шляхі іншых беларускіх клубаў у Кубку УЕФА будуць вызначаны 31 ліпеня. Пасля першага матча змагання з „Легіяй" „Гомель" павёз дамоў з Варшавы нулявую нічыю. Зазначу, што склад гомельцаў істотна заслаб пасля таго як каманду пакінуў Раман Васілюк — форвард вярнуўся дахаты ў Брэст. Сустрэча ж сталічнага МТЗ-РІПА са славацкай „Жылінай" была адзначана неверагоднай канцоўкай. МТЗ перамагаў дома 2:1, але баснійскі арбітр без усялякіх падставаў дадаў да другога тайма ажно 9 (!) хвілін і ўрэшце прызначыў у браму нашай каманды пенальці. У выніку 2:2 і мінімальныя шанцы калектыву Юрыя Пунтуса на агульную вікторыю. Пра гэта сведчыць няўмольная статыстыка. 11 разоў у еўракубках беларускія прадстаўнікі завяршалі выніковым парытэтам першы матч на сваім полі — і аніводнага разу пасля гэтага не здолелі выйсці ў наступны раунд.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Бляхі на дахі

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Калі на пачатку сямідзесятых гадоў мінулага стагоддзя пачалі будаваць гравійную дарогу з Трасцянкі праз Бялкі ў Агароднікі, то ўжо з Агароднікаў праз Іванкі-Рагазы была пабудавана жвіроўка да шашы Заблудаў — Нарва і ў вёску Агароднікі курсіраваў аўтобус ПКС ды там начаваў, а раніцай ад'язджаў у Гайнаўку. Пясок ды жвір на дарогу вазілі фурманкамі. На пабудову гэтай дарогі прыязджаў вазак з Люблінскага ваяводства, тут наймаў кватэру, хлявы для коней і прымаў на працу рабочых. Былі і мясцовыя вазакі, але яны ішлі на пабудовы калі ў гаспадарцы быў вальнейшы час. Калі ўжо дарога была гатовая, пусцілі аўтобус з Беластока ў Гайнаўку з раніцы — памятаю, што гэта было 3 мая. Каля прыпынку ў Бялках зрабілі браму, упрыгожылі яе ялінай ды кветкамі, а калі прыбыў аўтобус, шафёру і кандуктару падаравалі па паўлітроўцы гарэлкі ды на пракуску „пальцоўку". Пасля прыехалі яшчэ чыноўнікі з ПКСу, дык жа ім далі копу яек.

Прайшло некалькі гадоў і тады на сходзе члены дабраахвотнай пажарнай каманды з Бялкоў запрапанавалі грамадскі пачын, каб збудаваць на аўтобусным прыпынку будынак, які захоўваў бы пасажыраў ад дажджу і ветру. Тут варта адзначыць, што бялоцкія пажарнікі былі вельмі дружнымі і часта былі ініцыятарамі грамадскіх пачынаў пры рамонце і пабудове дарог ды шмат якіх іншых працах. Пры пабудове прыпынку звярнуліся ва ўправу гміны, каб дала матэрыял на пакрыццё даху. У той час быў вялікі дэфіцыт будаўнічых матэрыялаў. Тады я сказаў войту, што ў мяне ёсць дзесяць аркушаў фэльцаванае бляхі памерам 1 х 2 м, яна мне цяпер не вельмі патрэбная, бо асталася ад стадолы, якую я перакрыў. Войт абяцаў, што да года аддасць мне бляху за тую, якую я даў на дах прыпынку. Я чакаў 20 месяцаў.

Аднойчы, будучы фурманкай з сынам у Нарве, купілі мы два трохшыбныя вокны ў складзе Гміннага кааператыва. Убачылі, што ў жалезнай краме ляжыць многа бляхі. Я пайшоў да войта ў гмінную ўправу і сказаў яму, што мне патрэбная бляха, а яна цяпер ёсць у краме. Войт паклікаў да сябе працаўніка, які размяркоўваў будматэрыялы і загадаў даць мне пісульку, каб я мог купіць бляху, а паколькі яна прадавалася на кілаграмы, вылічылі мне 110 кілаграмаў. Я з войтавай пісулькай зайшоў у краму і падаў паперу прадаўцу, адчакаўшы сваё ў чарзе. Прадавец адказаў, што ані пісулькі, ані войтавага подпісу ён „не ганаруе". Для яго я мушу быць занесены ў імянны спісак. Я выйшаў з крамы і кажу сыну, што не хоча прадавец прадаць нам бляхі і за нішто мае войтаву пісульку. Пачуў гэтую гутарку чалавек з Тынявіч і кажа: „Для мяне ты даеш рады дапамагчы ў бядзе, а сваёй справы не можаш аформіць? Ідзі ў Гмінны камітэт ПАРП, там раскажы ўсё сакратару і другі раз не будзеш ехаць за бляхай!" Я кажу, што шкада мне прадаўца. „А ён што, цябе шкадуе?"

Праўда, я тады быў членам рэвізійнай камісіі Гміннага камітэта ПАРП у Нарве. Я зайшоў да сакратара, паказаў тую пісульку, расказаў, калі і на што пазычыў бляху гміне. Сакратар пазваніў войту, распытаў пра ўсё. Войт сказаў яму, што пазвоніць у праўленне ГС і папросіць прэзаса, каб той загадаў прадаўцу прадаць мне бляху. Сакратар сказаў, што пазвоніць туды сам і спытаецца ў прадаўца, чаму той не прымае пад увагу подпісу войта.

У праўленні ГС тэлефон прыняў намеснік прэзаса Васіль Грыц. Ён і сказаў: „Няхай Лук'янюк ідзе ў краму; пакуль зойдзе, прадавец будзе ўжо яго чакаць". Калі я даходзіў пад краму, чалавек з Тынявіч чакаў мяне з маім сынам. Бачыў ён, як з пякарні бег працаўнік у краму, бо ў жалезнай краме не было тэлефона. Калі я ўвайшоў у краму, прадавец спыніў абслугоўване кліентаў і папрасіў усіх выйсці з крамы, бо мусіць мяне абслужыць. Калі засталіся мы толькі ўдвух, спытаўся, чаму я хадзіў у камітэт. „Каб другі раз не ехаць па бляху ў Нарву, калі сёння ў мяне ёсць фурманка!"

Цяпер і будматэрыялаў удосталь. Абы былі грошы! Няма ўжо каму арганізоўваць грамадскія пачыны ў вёсках. Яны абязлюдзелыя, старэюць. А прыпынак у Бялках стаіць пусты. Тут толькі адзін аўтобус праязджае з Беластока ў 9^{00} у Бельск-Падляшскі, і то толькі ў тыя дні, калі дзеці ходзяць у школу. На канікулах і таго няма.

Настваралася цяпер новых палітычных партый, але са сваёй бядой няма да каго падацца!

Пра мінулае і сённяшняе чыгункі

Уладзімір СІДАРУК

Часта вяртаюся ўспамінамі да мінулых будняў, прафесіянальнай працы і грамадскай дзейнасці. Спаглядаю на пажаўцелыя выразкі з „Нівы", якія скрупулёзна захоўваю ў хатнім архіве. І тады ажываюць падзеі трыццацігадовай даўнасці. Вось, хоць бы прафсаюзная сустрэча людзей добрай работы. Праходзіла яна ў чаромхаўскім цэнтры культуры ў снежні 1974 г. Арганізатарам пасяджэння была прафсаюзная арганізацыя, а саўдзельнікамі — кіраўніцтва станцыі і партыйная арганізацыя. Мэтай сустрэчы было абмеркаванне задач прадпрыемства, яго дасягненняў і хібаў чыгуначнікаў на працы. Дыскусія зводзілася ў асноўным да двух апошніх спраў. Дзяжурны-распарадчык кранаў праблему дысцыпліны працы. „З гэтай не найлепш на станцыі, — канстатаваў прамоўца. — Кіраўнікі цягнікоў і кандуктары не ставяцца тэрмінова на працу, дзяжурны не адпраўляе паяздоў паводле раскладу язды. Без прычыны цягнік адпраўляецца са значным спазненнем са станцыі адпраўлення. І за гэта ніхто не нясе адказнасці. Іншая, не менш важная праблема, — працягваў дзяжурны, — гэта п'янства на рабоце. Многія працаўнікі прыходзяць на дзяжурства ў нецвярозым відзе або п'юць гарэлку на рабоце. Такую паталогію неабходна душыць у зародку". Іншай думкі быў дзяжурны па станцыі. Гэты меркаваў, каб карыкатуры п'яніц і гультаёў паказваць у публічным месцы ў насценгазеце. Гэта будзе больш балючым, чым дысцыплінарнае пакаранне.

З таго часу прайшло амаль трыццаць чатыры гады. Ці штосьці перамянілася на чыгунцы? Пэўна так. Чаромхаўская станцыя цяпер парастае пустазеллем. Няма партыйных арганізацый, прафсаюзныя існуюць адно на паперы, а іхнія важакі больш дбаюць пра свае інтарэсы, чым пра рабочых. З дысцыплінай усяляк бывае. Цягнікі як раней, так і зараз спазняюцца і ніхто за гэта не нясе адказнасці. Даваў я гэтаму прыклады ў сваіх допісах. А наконт п'янкі скажу такое: дастаткова праехаць з Беластока ў Чаромху на рэйкавым аўтобусе а 16-ай гадзіне. У другім вагончыку едуць амаль адны чыгуначнікі. Аб іхніх паводзінах лепш не гаварыць — адзін Садом ды Гамора. Піва, кілішак спіртнога і папяросы гэта амаль штодзённае відовішча для падарожных. Паколькі ў аўтобусе няма туалета, тады кіраўнік цягніка з машыністам вымушаны затрымаць аўтобус для апівошаў на „даўжэйшую" стаянку ў Страблі. Там асобені не спяшаюцца ў туалет, які знаходзіцца на пероне, а фізіялагічныя патрэбы спраўляюць зразу за вагончыкам у перонах.

Ваяводскія дажынкі ў Гайнаўцы

Сёлетняе Свята ўраджаю адбудзецца 21 верасня ў Гайнаўцы. Урачыстасць будзе мець экуменічны характар — у ёй прымуць удзел іерархі Каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы.

Варта дадаць, што ў папярэднія гады ваяводскія дажынкі адбываліся м.інш у Драгічыне і Саколцы.

Фэст у Семяноўцы

9 жніўня г.г. па гадзіне 15.30 пачнецца фэст у Семяноўцы (Гайнаўскі павет). З канцэртам выступіць дзесяць мастацкіх калектываў — з Беластока, з Гарадоцкай, Міхалоўскай, Нараўчанскай, Нарваўскай і Супрасльскай гмінаў ды „Неруш" з Рэспублікі Беларусь.

На штогадовае народнае гулянне запрашаюць усіх ахвотных улады Нараўчанскай гміны.

(яц)

Адгаданка

1. першае месца ў дачыненні да дасягненняў, заслуг, вартасцей, 2. хлебнае збожжа, 3. яшчэ не сена, 4. гарадскі пасёлак у Браслаўскім раёне на рацэ Друйка, 5. штат у Скалістых горах, 6. цэнтр заходнесібірскай нафтаноснай вобласці, 7. памяшканне ў школе, дзе займаюцца вучні, 8. мера механічнага ўзаемадзеяння, якая вызначаецца ў дынах, 9. „партнёр" каліны, 10. колішні балгарскі ўладар, 11. салдат егерскага палка, 12. гмінная мясцовасць на рацэ Арлянцы, 13. між падставоўкай і ліцэем, 14. Азія або Афрыка, 15. краіна з Градчанскім замкам.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — яўрэйская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 26 нумара

Ваба, вянок, дамба, джын, канон, Мележ, цана.

Рашэнне: **Абяцанне воблакам, выкананне дажджом.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.

Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Сяброўская бяседа-2008

Фотарэпартаж Міры ЛУКШЫ

У Гарадку і наваколлі
Ад падростка аж да дзеда
Кажуць, што нідзе няма й ніколі,
Як „Сяброўская бяседа”!
Тут пачуеш волю, песню
Ад якой душа завяне.
Тут гуляй, спявай, хоць трэсні,
Крыва на цябе ніхто не гляне.
Бо зямелька тут гасцінна
І народ неваравіты,
Для суседзяў бліжшых, дальшых
І прыязны, і адкрыты.
А Барык адвечна горды
Гасцей радасна прымае
І свае падвоі шчыра
Усім ахвотным адкрывае.
І сябры верныя сышліся,
Што шануюцца ўзаемна.
Спробуй тут разбярыся,
Хто з-над Буга, хто з-над Немна.
Чутна розныя гаворкі
З Польшчы, Беларусі, Украіны.
На „Бяседзе” мысль галоўна:
Жыць у згодзе як радзіна.
На эстрадзе песні, танцы,
Усё прыгожае на дзіва
І з Падляшша, з заграніцы,
Розных жанраў і матываў.
Прыгажуня дзеліць торта,
Бо ў сяброўстве так прыстала
І жадае шчасця мноства,
А сяброўству — вечна хвала.
На расстанне чаркай цокнем
І сардэчна сціснем рукі,
Каб праз год зноў на „Бяседзе”
Слухаць так прамілых гукаў.

МІЖНАРОДНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПА СПРАВАХ МІГРАЦЫІ (IOM — INTERNATIONAL ORGANIZATION FOR MIGRATION)

узнікла ў 1951 годзе. Арганізацыя трымаецца прынцыпу, што арганізаваныя і гуманітарныя міграцыі даюць карысці як мігрантам, так і грамадствам.

IOM пры дапамозе сваіх 300 офісаў на ўсім свеце дапамагло больш чым 13 мільёнам людзей.

IOM гарантуе арганізаваныя і гуманітарныя вяртанні ды рэінтэграцыйную дапамогу мігрантам, якія не могуць або не хочуць застацца ў прыёмнай краіне і хочуць дабравольна вярнуцца да сваёй краіны паходжання.

Табе таксама можам дапамагчы!
Міжнародная арганізацыя па справах міграцыі
Тэлефон: 022 538 91 69
Internet: http://www.iom.pl

Праект суфінансуецца Еўрапейскай Камісіяй у рамках праграмы „EC 205 Return Preparatory Actions”.

Ці задумваешся над сваім вяртаннем у сваю краіну?
IOM МОЖА ТАБЕ ДАПАМАГЧЫ!
Праграма дабравольных вяртанняў

Вяртанне дадому з дапамогай IOM
Дабравольнае вяртанне?

Дабравольныя вяртанні ладзяцца IOM у рамках праграмы гуманітарнай дапамогі. Дабравольнае вяртанне абазначае, што:

ТЫ прымаеш рашэнне аб вяртанні
ТВАЁ вяртанне адбудзецца з павагай да годнасці
АТРЫМАЕШ дапамогу на ўсіх этапах падарожжа
ТВАЁ падарожжа — добра падрыхтаванае і бяспечнае

Падача заявы?

Калі Ты мігрант з-па-за Еўрасаюза, калі ў Цябе нявызначаны юрыдычны статус і хочаш вярнуцца дамоў:

1. Патэлефануй нам з мэтай дамовіцца на візіт: (022) 538 91 69.
2. Прыйдзі ў наш офіс, каб болей даведацца аб праграме дабравольных вяртанняў і запоўніць дэкларацыю.
3. Калі падыходзіш да праграмы, тады сарганізуем Тваё падарожжа і праінфармуем Цябе аб сітуацыі ў краіне паходжання і магчымасці атрымання рэінтэграцыйнай дапамогі.
4. У дзень ад'езду сустрэнемся з Табой на вакзале або ў аэрапорце, дзе перадамо Табе Твой пашпарт, білет і іншыя дакументы.
5. Супрацоўнік IOM сустрэнецца з Табою ў краіне транзіту і/або ў краіне — месцы прызначэння з мэтай аказаць далейшую дапамогу ў падарожжы.

Што можам для Цябе зрабіць?

IOM прапануе наступную дапамогу для кожнай асобы, якая падыходзіць да праграмы дабравольных вяртанняў:

IOM арганізуе ўсё падарожжа і пакрывае ўсе яго кошты.

IOM дастаўляе інфармацыю на тэму сітуацыі ў краіне паходжання.

Дадаткова IOM можа дапамагчы Табе адаптавацца ў краіне паходжання шляхам аказання рэінтэграцыйнай дапамогі.

Рэклама

03.08 — 09.08

(22.03. — 20.04.) Зоркі прапануюць табе вылазку на прыроду. Пахадзі па шляхах, пажыві ў палатцы, калі любіш больш камфорту, дык — на турбазу ў лесе. Хоць на выхадныя! 7.08. можа выбіць цябе з каляіны неакрэсленасць сітуацыі. Моцна пакажацца твая патрэба дамінацыі.

(21.04. — 21.05.) Быкам варта пабываць на астравах, неабавязкова экзатычных. Памылкі і недакладнасці ў дэталях будуць турбаваць на пачатку тыдня. 06.08. магчымы непрадбачаныя падзеі. Будзеш падабацца ды і сам будзеш схільны да (праўда, лёгкіх, несур'ёзных) пачуццяў.

(22.05. — 22.06.) Калі вы не выбраліся за мяжу, не атрымаўшы, скажам, візы, падавайце паперы ў консульства — не будзе ніякіх праблем. Не адмаўляйцеся ад дапамогі страхавой фірмы. Перад вамі стануць былыя сябры, партнёры і іншыя каханыя асобы.

(23.06. — 23.07.) У падарожжы выбірай міні-гасцініцы сямейнага тыпу, з добрай кухняй, прыемнай абслугай. Будзеш схільны дараваць блізкім усе грашкі, памылкі і хібы. Старайся не ацэньваць іншых, бо адкуль табе ведаць, што ў іх сэрцах!

(24.07. — 23.08.) А ты выбірайся ў этнічнае падарожжа, неабавязкова ў іншую краіну. Сонца пакажа табе, якім шляхам табе ісці, каб дайсці да поспеху. Патрэбны табе актыўны адпачынак.

(24.08. — 23.09.) Табе варта паехаць у Прыбалтыку, асабліва ў Літву. Могуць адбыцца вельмі дзіўныя, неспадзяваныя сустрэчы. Старайся запамятаць імёны ўсіх новапазнаных людзей! Зважай на тое, каму памагаеш; ад некаторых, каму пакажаш сваю перавагу, удзячнасці і не чакай!.

(24.09. — 23.10.) Выберыся ў падарожжа на найбліжэйшую бацькаўшчыну. Калі твае дзяды выводзяцца з іншай краіны — паедзь туды; хопіць хоць ступіць на родную зямлю. Венера ў Блізнятах не спрыяе манагаміі! Прыемнасці ў завялікіх дозах шкодзяць!

(24.10. — 22.11.) Скарпіёнам варта пабываць у Харватыі, найлепш непадалёк Задара. Не поркай калком у мурашнік, не раз'ятрывай іншых і не стаў пытанняў рубам. Інтуіцыя беспамылкова паможа табе пачуць фальшывыя ноты ў голасе некаторых асоб.

(23.11. — 22.12.) Стральцы не будуць шкадаваць грошай, калі пабываюць у Пекіне (пачатак алімпійскіх гулняў!). Адно благавата — там найгарачэйшыя месцы! Ды і тут выбухі жарсцяў! Горача і ў сужонскай спальні. Нерухавасць стоміць цябе больш чым найбольшы высілак.

(23.12. — 20.01.) Казярогу варта з'ездзіць у экзотыку, скажам, у Беліз (там якраз фестываль культуры майа). Шмат цікавых мерапрыемстваў і сустрэч. Не рабі мінаў такіх, быццам ты — сусветны разумнік!

(21.01. — 19.02.) Вадалеяў зоркі запрашаюць у Нямеччыну, асабліва 9.08. у Хагенбек, на фестываль класічнай музыкі. Але замест выдаваць грошы на падарожжы і званкі, спачатку правер ці тое, чаго шукаеш — не побач з табою. Побач могуць паявіцца круцялі-майстры аўтарэкламы.

(20.02. — 21.03.) Рыбам варта выбрацца ў падарожжа па святых месцах, можна на паломніцтва ці на курсы-абучэнне або лагеры з рэлігійным ухілам. Найлепшы варыянт — падарожжа ў Іерусалім. Вакол цябе мастацкі балаган і творчае замяшанне. Ды сваё „не!” кажы больш рашуча! Не дайся збіцца з панталыку!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960